

ІМГНЕННІ «СЛАВЯНСКАГА БАЗАРУ» 12

НАРОДЖАНАЯ, КАБ ПЕРАМАГАЦЬ 13



Выдаецца з 9 чэрвеня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

24 ЛІПЕНЯ 2018 г. АЎТОРАК № 139 (28755)

**ЛІЧБА ДНЯ**

**Больш як 3,5 тысячы**

*жыхароў Гродзенскай вобласці адкрылі сваю справу на ўмовах самазанятасці сёлета па стане на 1 ліпеня. У параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года колькасць такіх грамадзян узрасла на 1,4 тысячы. Гэта сведчыць аб павышэнні самазанятасці насельніцтва і ўключэнні яго ў эканамічную дзейнасць. Найбольш папулярным сярод грамадзян Гродзенскага рэгіёна відам дзейнасці па-ранейшаму застаецца продаж твораў жывапісу, графікі, скульптуры, вырабаў народных мастацкіх рамёстваў, прадукцыі кветкаводства, дэкаратыўных раслін, іх насення і расады, жывёл.*

# Выпрабаванне хлебнай нівай



Фота БелТА.

Новы камбайн «Палессе GS2124» вытворчасці «Гомсельмаш» праходзіць выпрабаванні на палях ААТ «Тураўшчына» Жыткавіцкага раёна. Гэта збожжаўборачны камбайн з гібрыдных тэхналагічнай схемай, абсталяваны сістэмамі аўтаваджэння і дакладнага земляробства. Камбайнер Генадзь КОТ і кіроўца-выпрабавальнік Яўген КАНАВАЛАЎ ацанілі ўсе тэхнічныя магчымасці новай машыны.

**КОРАТКА**

- **У Беларусі засноўваецца юбілейны медаль «20 гадоў органам і падраздзяленням па надзвычайных сітуацыях Рэспублікі Беларусь». Адпаведны ўказ падпісаў кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка.**
- Экіпаж дзяржпрадпрыемства «Саўгас «Рачкавічы» Беларускай чыгункі — браты Аляксандр і Уладзімір Анціпцавы — першым у Слуцкім раёне і Мінскай вобласці намалацiлі адну тысячу тон збожжа.
- **Спецыялісты «Мінскводаканала» штогод мяняюць каля 300 тысяч прыбораў уліку вады ў кватэрах мінчан.**



- Успышка афрыканскай чумы свіней зафіксавана на буйным свінагадоўчым комплексе ў Наўгародскай вобласці Расіі.

ISSN 1990 - 763X

■ Падрабязнасці

## Рэгістрацыя нерухомасці па новых правілах

Аўтарызаваныя пасрэднікі, скарочаныя тэрміны і экстэрытарыяльнасць

**Зберагчы час, пазбегнуць недакладнасцяў і спрасціць працэс рэгістрацыі — усё гэта змены ў Закон Рэспублікі Беларусь «Аб дзяржаўнай рэгістрацыі нерухомай маёмасці, правоў на яе і здзелак з ёй». Новаўвядзенні ўступілі ў сілу літаральна ўчора, роўна праз 16 гадоў пасля з'яўлення самога закона. У новую рэдакцыю, напрыклад, уводзіцца паняцце «электронная копія дакумента на папяровым носьбіце», мяняецца азначэнне «змяненне мяжы зямельнага ўчастка», удакладняюцца патрабаванні аб неабходнасці легалізаваць, перакладаць на беларускую ці рускую мову і сведчыць у натарыуса дакументы па рэгістрацыі, якія былі складзены за мяжой. «Звязда» разабралася ў нюансах, якія зацікавяць і сённяшніх, і патэнцыйных уласнікаў нерухомасці.**

### Маёмасныя паверанныя

Як кажуць спецыялісты, змены абумоўлены агульнымі тэндэнцыямі ў беларускім заканадаўстве, якія датычацца развіцця лічбавых і інфармацыйных тэхналогій, а таксама развіцця прадпрымальніцкай ініцыятывы разам з дэбюракратызацыяй.

Адно з самых значных новаўвядзенняў закона — з'яўленне інстытута аўтарызаваных пасрэднікаў, якое дасць грамадзянам і юрыдычным асобам дадатковыя магчымасці. Гэтыя суб'екты возьмуць на сябе клопаты па падрыхтоўцы дакументаў для рэгістрацыі. Чалавеку не прыйдзецца атрымліваць дакументы на нерухомасць, звяртацца да рэгістратара, яшчэ раз ісці ў БТІ, стаяць у чэргах, хадзіць аплачваць паслугі...

СТАР. 7

■ Нагода ганарыцца

## «ГЭТА НЕ ПАМЫЛКА І НЕ МІФ»

Як роўна 400 гадоў таму беларусы выдалі самую папулярную кнігу

**Пра ўшанаванне друкаванага слова ды любоў да кніжнай мудрасці гаварылі яшчэ Ефрасіння Полацкая і Кірыла Тураўскі. Археалагічныя знаходкі пацвярджаюць: нашы продкі ўмелі чытаць і пісаць з самых даўніх часоў, прычым актыўна гэтымі ведамі карысталіся. Настаўнікі знаёмілі вучняў з таямніцамі слова праз тэксты рэлігійных кніг, найперш — Псалтыра і Новага Запавета. Аднак роўна 400 гадоў таму, 24 ліпеня 1618 года ў мястэчку Еўе (цяпер на тэрыторыі Літвы) была надрукавана асаблівая кніга, праваобраз цяперашняга падручніка для самых маленькіх школьнікаў. «Буквар языка словенска» стаў першым у свеце выданнем з такой назвай. Пра гэту надзвычайную падзею старажытных часоў, яе перадумовы і наступствы расказаў намеснік дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі па навуковай рабоце і выдавецкай дзейнасці Алесь СУША.**

### КНІГА ЯК ВЫЙСЦЕ З КРЫЗІСУ

— Калі паглядзець на археалагічныя знаходкі, стане зразумела, што адукацыя ў мінулыя часы не была такой ужо прывілеяванай з'явай. Тыя ж берасцяныя граматы, дзе купцы абмяркоўвалі побытавыя пытанні, сведчаць, што грамата была вядома не толькі князям і манахам, але і мяшчанам, — расказвае спадар Алесь.

СТАР. 8



Тытульны аркуш першага ў свеце буквара.

# ТЭЛЕФОННАЯ РАЗМОВА ПРЭЗІДЭНТАЎ

**Учора па ініцыятыве расійскага боку адбылася тэлефонная размова Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі з Прэзідэнтам Расіі Уладзімірам Пуціным, паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.**

У першую чаргу бакі абмеркавалі аспекты двухбаковага парадку дня, прычым акцэнт быў зроблены на пашырэнні гандлёвага супрацоўніцтва. Акрамя таго, кіраўнікі дзяржаў дамовіліся працягнуць узаемныя намаганні для захавання пазітыўнай дынамікі ўзаемадзеяння.

Дарэчы, Прэзідэнт Расіі запрасіў Аляксандра Лукашэнку ў сваю краіну — сустрэча можа адбыцца ў Сочы, тады ж плануецца дэталёва разгледзець увесь спектр двухбаковых адносін.

Прасоўванне інтэграцыі ў Еўразійскім эканамічным саюзе, рэалізацыя дасягнутых раней дамоўленасцяў паміж краінамі — удзельніцамі ЕАЭС — гэта тыя тэмы, якім прэзідэнты таксама ўдзялілі ўвагу ў тэлефоннай размове. Таксама бакі абгаварылі шэраг арганізацыйных пытанняў, паколькі 27 ліпеня ў Санкт-Пецярбургу адбудзецца пасяджэнне Еўразійскага міжурадавага савета.

Пасля лідары дзвюх краін перайшлі да міжнароднага парадку дня — у прыватнасці, казалі пра адносіны Расіі і ЗША, а таксама пра выніні мінулай сустрэчы Уладзіміра Пуціна і Дональда Трампа ў Хельсінкі. Аб нюансах апошняй Прэзідэнт Расіі праінфармаваў кіраўніка беларускай дзяржавы.

Акрамя таго, асноўная ўвага ў ходзе размовы была ўдзелена пытанням кантролю над узбраеннямі і падаўжэння Дагавора аб скарачэнні стратэгічных наступальных узбраенняў (СНВ- III) паміж Расіяй і ЗША. Дарэчы, тэрмін дзеяння дакумента заканчваецца ў лютым 2021 года.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**

# АДКАЗНЫЯ ЗА ПАМЯЦЬ

**У 2018 — першым паўгоддзі 2019 года будуць добраўпарадкаваны і аднаўлены мемарыялы і помнікі воінскай славы, адзіночныя і брацкія магілы воінаў, якія загінулі ў гады Першай сусветнай і Вялікай Айчыннай войнаў, воінскія могілкі, асобныя воінскія ўчасткі агульных могілак, месцы масавага пахавання грамадзянскага насельніцтва. Адпаведнае распараджэнне падпісаў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка, паведамілі ў прэс-службе кіраўніка дзяржавы.**

Савету Міністраў даручана забяспечыць зацвярджэнне правілаў добраўпарадкавання месцаў пахаванняў. Яны прадугледжваюць устанаўленне рэжымаў аховы і выкарыстання гэтых месцаў і накіраваны на захаванне грамадскага парадку, папярэджанне пашкоджання, разбурэння, знішчэння і іншага шкоднага ўздзеяння на іх, выкліканага гаспадарчай або іншай дзейнасцю.

Мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы надзяляюцца выключнай кампетэнцыяй на прыняцце рашэнняў, якія датычацца ўтрымання, добраўпарадкавання і падтрымання ў належным санітарным стане месцаў пахаванняў.

Аблвыканкамам і Мінскаму гарвыканкаму даручана забяспечыць добраўпарадкаванне і аднаўленне месцаў пахаванняў, арганізаваўшы пры неабходнасці правядзенне конкурсаў на архітэктурна-мастацкае рашэнне месцаў, якія добраўпарадкоўваюцца, вызначэнне заказчыкаў і выканаўцаў адпаведных работ. Яны таксама павінны будуць пры фарміраванні абласных бюджэтаў і бюджэту Мінска на чарговы фінансавы год прадугледзець сродкі на рэалізацыю гэтага распараджэння і прыняць меры па прыцягненні добраахвотных ахвяраванняў ад айчынных і замежных юрыдычных і фізічных асоб.

Мерапрыемствы па добраўпарадкаванні і аднаўленні месцаў пахаванняў будуць праведзены ў мэтах падрыхтоўкі да святкавання 75-й гадавіны вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і фарміравання паважлівага стаўлення да падзей гісторыі дзяржавы, што прывялі да масавых ахвяр сярод грамадзянскага насельніцтва.

# Жыллё можна купіць

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падпісаў Указ № 287 «Аб продажы жылых дамоў (кватэр) у сельскай мясцовасці», які стварае дадатковыя ўмовы для замацавання кадраў у вёсцы. Пра гэта паведамляецца на афіцыйным інтэрнэт-партале кіраўніка дзяржавы.**

Дакумент устанаўлівае правы мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў базавага тэрытарыяльнага ўзроўню або ўпаўнаважаных імі арганізацый прадаваць заселеныя жылыя дамы або кватэры грамадзянам, якія там пражываюць. Норма датычыцца жылых памяшканняў, якія былі перададзены арганізацыям жыллёва-камунальнай гаспадаркі пры рэалізацыі ўказаў па фінансавым аздараўленні сельскагаспадарчых прадпрыемстваў.

Указ таксама вызваляе сельгасарганізацыі ад падаткаабкладання па аперацыях, звязаных з пераводам на адпаведныя райвыканкамы доўгу па льготных крэдытах, атрыманых на будаўніцтва, рэканструкцыю і набыццё жылых дамоў ці кватэр. Указ уступае ў дзеянне праз тры месяцы пасля яго апублікавання.

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Фінансавая G20 назвала рызыкі для сусветнай эканомікі

Фінансавая «дваццатка» лічыць, што асноўнымі кароткатэрміновымі і сярэднетэрміновымі рызыкамі сусветнай эканомікі на цяперашні момант з'яўляюцца фінансавая ўразлівасць, рост напружанасці ў гандлі і геапалітыцы, а таксама няроўнасць і слабыя структурныя рост. Гэтыя высновы вынікаюць з камюніке па выніках пасяджэння міністраў фінансаў і кіраўнікоў цэнтральных банкаў G20 у Буэнас-Айрэсе. Сусветная эканоміка працягвае расці, але краіны, якія развіваюцца, змагаюцца з валацільнасцю рынкаў і адтокам капіталаў, канстатавалі міністры фінансаў і кіраўнікі цэнтрабанкаў «дваццаткі». У той жа час глабальны эканамічны рост працягвае заставацца ўстойлівым, узроўні беспрацоўя цяпер самыя нізкія за дзесяць гадоў, гаворыцца ў дакуменце. Тым не менш апошнім часам рост быў менш сінхронны, адзначаюць міністры і кіраўнікі рэгулятараў.

### Парламент Кубы ўхваліў канстытуцыйную рэформу



Нацыянальная асамблея народнай улады Кубы на сваім пасяджэнні ўхваліла канстытуцыйную рэформу, якая прадугледжвае змяненне асноўнага закона краіны. Як паведамляе партал Granma, за праект новай канстытуцыі дэпутаты прагаласавалі аднагалосна. Таксама парламентам прапанавана ў тэрмін з 13 жніўня да 15 лістапада вынесці новую канстытуцыю на абмеркаванне ўсенароднага рэферэндуму. Новая канстытуцыя Кубы ўводзіць пасаду прэзідэнта, абмяжоўвае тэрмін яго знаходжання на пасадзе для кіраўніка дзяржавы дзесяццю гадамі, а таксама прызнае правы прыватнай уласнасці. Таксама адным з асноўных прынцыпаў дзейнасці кубінскай дзяржавы называецца будаўніцтва сацыялізму. Упершыню тэкст канстытуцыі ўключае забарону на дыскрымінацыю па гендарных прыкметах.

### Прэзідэнт Ірана заклікаў Трампа «не жартаваць з агнём»

Прэзідэнт Ірана Хасан Раўхані заклікаў амерыканскага лідара Дональда Трампа «не жартаваць з агнём», падкрэсліўшы, што Тэгеран «ні з кім не ваюе», паведамляецца на афіцыйным сайце кіраўніка дзяржавы. Раней у Дзярждэпе ЗША заявілі, што Вашынгтон паспрабуе пераканаць саюзнікаў цалкам спыніць закупку нафты з Ірана да пачатку лістапада, а кіраўнік амерыканскага Мінфіна Стывен Мнучын адзначаў, што Злучаныя Штаты гатовыя ўводзіць санкцыі супраць Расіі, Кітая ці любой іншай краіны, якая працягне закупкі нафты ў Ірана насуперак пазіцыі Вашынгтона. Дзяржсакратар ЗША Майкл Пампеа заявіў, што амерыканскія санкцыі ў дачыненні да нафтавага сектара Ірана пачнуць дзейнічаць з 4 лістапада, пасля гэтай даты пастаўкі нафты адтуль будуць лічыцца парушэннем санкцый. «Спадар Трамп, мы — вялікі народ, мы гарантуем бяспеку воднай артэрыі ў рэгіёне на працягу гісторыі. Не дражніце, не жартуйце з агнём, вы пашкадуеце аб гэтым», — сказаў Раўхані на сустрэчы з іранскімі дыпламатамі.

### Ахвярамі спякоты ў Японіі за тыдзень сталі 65 чалавек

Па меншай меры 65 чалавек загінулі за мінулы тыдзень у Японіі з-за небывалай спёкі, каля 21 тысячы чалавек звярнуліся па дапамогу да ўрачоў, перадало інфармацыйнае агенцтва Kyodo. Гэтыя звесткі адносяцца да перыяду з 16 да 22 ліпеня, а з улікам рэкордна высокай тэмпературы 23 ліпеня, якая дасягнула 41,1 градуса ў ваколіцах Токіа, колькасць ахвяр і пацярпелых ад цеплавога ўдару ўзрасла. Так, жо паступілі паведамленні аб гібелі па меншай меры шасці пажылых людзей у раёнах, прылеглых да Токіа. Улады Японіі заклікалі насельніцтва пазбягаць перагрэву, карыстацца кандыцыянерамі і піць у вялікай колькасці ваду. Спякота доўжыцца ўжо два тыдні пасля таго, як на захадзе і ў цэнтральнай частцы краіны ліўневыя дажджы прывялі да паводак і апоўзняў і да гібелі ў выніку іх звыш двух сотняў чалавек.


Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

**Извещение о проведении аукциона**

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б |
| **Продавец** | СООО «Белавтотранзит», г. Минск, пр. Победителей, 31-1 |

**Предмет аукциона**

**Месторасположение предмета аукциона:** г. Брест, ул. Советская, 73

| Наименование | Назначение | Общ. пл. | Инв. номер |
|---|---|---|---|
| **Универсальный дом торговли** | Здание специализир. иного назначения | 5985,8 кв. м | 100/С-3307 |
| **Водопроводная сеть** | Сооружение специализир. водохоз. назначения | 123,0 м | 100/С-51333 |
| Составные части и принадлежности: четыре колодца, три трубопровода, домовой ввод. | | | |
| **Подземная теплосеть** | Сооружение специализир. энергетики | 130,0 м | 100/С-51331 |
| Составные части и принадлежности: колодец | | | |

**Сведения о земельном участке**: пл. **0,2937** га, предоставлен продавцу на праве аренды (доля в праве – 151/1000) сроком по 22.10.2103 для размещения объектов розничной торговли

**Начальная цена с НДС 20 % – 7 345 980,17 бел. руб.**

**Обременения:** частичная аренда. Подробная информация на сайте www.cpo.by

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на счет BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **15** рабочих дней после проведения аукциона |

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после подписания договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения аукциона** | **28.08.2018 в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, оф. 4б, ООО «ИПМ-Консалт оценка» |
| **Дата и время окончания приема документов** | **27.08.2018 до 17.00** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, оф. 4б, ООО «ИПМ-Консалт оценка» |

**Контакты: тел: +375 17-280-24-41; +375 29-317-95-42.**
**Email: auction@ipmconsult.by**



Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

**Извещение о проведении повторного аукциона**

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | Минское районное потребительское общество, г. Минск, ул. Бровки, 24 |

**Предмет аукциона**
**Местоположение – Минская обл., Минский р-н**

| Наименование | Общ. пл. | Инв. номер | Адрес (населенный пункт) |
|---|---|---|---|
| **Лот № 1** | | | |
| **Здание магазина № 6** | 71,5 кв. м | 600/С-73407 | Боровлянский с/с, д. Королев Стан |
| Составные части и принадлежности: четыре холодных пристройки | | | |

**Сведения о земельном участке**: пл. **0,0671** га предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для обслуживания здания магазина № 6

**Начальная цена лота № 1 с НДС 20 % – 59 900,00 бел. руб.**
(снижена на 13 %)

| Наименование | Общ. пл. | Инв. номер | Адрес (населенный пункт) |
|---|---|---|---|
| **Лот № 2** | | | |
| **Заготовительный павильон** | 257,2 кв. м | 600/С-153282 | г. Заславль, ул. Набережная, д. 2Г |
| Составные части и принадлежности: пристройка | | | |

**Сведения о земельном участке**: пл. **0,0534** га предоставлен продавцу на праве аренды для размещения объектов розничной торговли (срок действия по 24.09.2018). Ограничения (обременения) прав: водоохранная зона Заславского водохранилища, охранная зона линий электропередачи напряжением до 1000 Вольт (пл. 0,0030 га)

**Начальная цена лота № 2 с НДС 20 % – 59 000,00 бел. руб.**
(снижена на 35 %)

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001; в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области, БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять)** рабочих дней после проведения аукциона.

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 27.06.2018

**Аукцион состоится 07.08.2018** в 14.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703. Заявления на участие и **необходимые документы принимаются по 06.08.2018** до 17.00 по указанному адресу. Тел.: +375 17 280-36-37; 8 029 317-95-42. www.cpo.by**. Email: auction@cpo.by**



Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

**Извещение о проведении аукциона**

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | ОАО «Калинковичский мясокомбинат», Гомельская обл., г. Калинковичи, ул. Северная, 8 |

**Предмет аукциона**
**Месторасположение: Гомельская обл., Калинковичский р-н, Липовский с/с, аг. Липов, ул. Советская, 26**

| Наименование (назначение) | Общ. пл. | Инв. номер |
|---|---|---|
| **Здание комплексного приемного пункта** | 161,4 кв. м | 333/С-24121 |

**Сведения о земельном участке**: пл. **0,0415 га** предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для обслуживания здания комплексного приемного пункта

**Начальная цена с НДС 20 % – 16 160,72 бел. руб.**

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с № BY60BLBB30120191021390001001; в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять)** рабочих дней после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30** (тридцати) дней после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения аукциона** | **29.08.2018** в 11.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Дата и время окончания приема документов** | **27.08.2018** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Контактные телефоны** | **+375 17 280-36-37; +375 29 317-95-42. Email: auction@cpo.by** |

■ Абітурыент-2018

# ФАКУЛЬТЭТ МІЖНАРОДНЫХ АДНОСІН ЗНОЎ У ЛІДАРАХ

## гэтым разам па кошце платнага навучання

На гэтым тыдні ў беларускіх ВНУ завяршаецца залічэнне на бюджэтную форму навучання. У тых, каму не пашанцавала трапіць на бюджэтнае месца, застаецца магчымасць падаць свае дакументы на платную форму навучання. Але на якія сумы трэба разлічваць сям'і, якая прымае такое важнае рашэнне на чатыры-пяць гадоў наперад? Пакуль што далёка не ўсе ВНУ агучылі кошт навучання на 2018/2019 навучальны год. У апошнія гады самыя высокія цэны выстаўлялі Белдзяржуніверсітэт і Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі. БДУІР пакуль з новымі цэнамі не вызначыўся, а вось на сайце Белдзяржуніверсітэта ўжо можна азнаёміцца з новымі «тарыфамі».

Даражэй за ўсё ацэнена навучанне на дзённай форме на спецыяльнасцях «міжнароднае права», «правазнаўства» і «эканамічнае права» — тут цэны дасягаюць 3575 рублёў у год. Такім чынам факультэт міжнародных адносінаў і юрыдычны факультэт лідзіруюць у краіне не толькі па прахадных балах...

Навучанне на эканамічным факультэце для студэнтаў першага—трэцяга курса будзе каштаваць 3467 рублёў, на біялагічным — 3223 рублі, на факультэце журналістыкі — ад 3223 да 3395 рублёў, на факультэце прыкладной матэматыкі і інфарматыкі — 2964 рублі, хімічным і фізічным — 2673 рублі.

Танней за ўсё вучыцца ў галоўным універсітэце краіны будзе на спецыяльнасці «сацыяльная работа», а таксама на рускай і беларускай філалогіі, дзе «кошт» складзе 2354 рублі. Выразна прасочваецца мінулагодняя тэндэнцыя — попыт з боку абітурыентаў моцна ўплывае на «цэннікі» на адукацыю, інакш як яшчэ можна растлумачыць той факт, што падрыхтоўка журналіста ацэньваецца ў значна большую суму, чым падрыхтоўка, напрыклад, філолага?

Між іншым, колькі гадоў таму адной з самых дарагіх лічылася ў краіне медыцынская адукацыя. Але, напрыклад, у Віцебскім дзяржаўным медыцынскім універсітэце год навучання на самым дарагім стаматалагічным факультэце абыдзецца сям'і першакурсніка ў 3158 рублёў за год. На лячэбным факультэце — у 2737 рублёў, а на фармацэўтычным — у 2713 рублёў.

У Гродзенскім медуніверсітэце год навучання для першакурснікаў на спецыяльнасці «лячэбная справа» будзе каштаваць 2745 рублёў, «педыятрыя» і «медыка-псіхалагічная справа» — 2712 рублёў, «медыка-дыягнастычная справа» — 2626 рублёў.

Дзённая форма навучання для першакурснікаў Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта ацэньваецца ў 2490 рублёў, што зноў-такі — значна менш, чым на журфаку, эканамічным факультэце ці на факультэце міжнародных адносін у БДУ.

У Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэце ў 2018/2019 навучальным годзе кошт навучання на дзённай форме для першакурснікаў складзе 2500 рублёў на спецыяльнасцях «музычнае мастацтва, рытміка і харэаграфія» і «музычнае мастацтва і сусветная мастацкая культура». Ніжэйшым будзе кошт на спецыяльнасцях «выяўленчае мастацтва, чарчэнне і народныя мастацкія промыслы» і «выяўленчае мастацтва і камп'ютарная графіка» — 2476 рублёў. Студэнты першага курса спецыяльнасцяў з вывучэннем замежнай мовы за год заплацяць 2380 рублёў. Кошт платнага навучання на іншых спецыяльнасцях складзе ў БДПУ 2316 рублёў.

Вышэйшую адукацыю на ўмовах аплаты ў Беларусі атрымлівае прыкладна палова ад агульнай колькасці студэнтаў. У бягучым годзе на першую ступень навучання ў ВНУ плануецца прыняць каля 54,4 тысячы чалавек, у тым ліку за кошт бюджэту — 26,5 тысячы.

**Надзея НІКАЛАЕВА**

■ Падрабязнасці

# ПРЫЧЫНЫ ЖОРСТКАГА ЗАБОЙСТВА ВЫСВЯТЛЯЮЦЦА

У Бабруйску працягваецца расследаванне жахлівага злачынства, ахвярамі якога сталі дзве маладыя жанчыны 26 і 27 гадоў. Як спачатку паведамлялася на сайце УУС Магілёўскага аблвыканкама, дзяўчаты былі знойдзены мёртвымі ў кватэры 36-гадовага бабруйчаніна, раней судзімага. Яны пазнаёміліся з мужчынам у кавярні, потым на таксі адправіліся да яго дамоў. Невядома, як развіваліся падзеі, але а 7-й гадзіне раніцы на кароткі нумар 102 ад адной з сяброўак паступіў сігнал з просьбай аб дапамозе. На жаль, яна не змагла дакладна паведаміць, па якім адрасе іх шукаць. Тыя каардынаты, якія называла няшчасная, аказаліся не зусім дакладнымі. Калі аператыўнікі, нарэшце, выйшлі на забойцу, жанчынам ужо нельга было дапамагчы. Як удакладніла **афіцыйны прадстаўнік Следчага Камітэта Рэспублікі Беларусь Юлія ГАНЧАРОВА**, яны былі знойдзены ў ванным пакоі бабруйчаніна з рознымі колата-рэзанымі ранамі. Самога ж гаспадара кватэры затрымалі на вуліцы. Ён быў у нецвярозым стане.

— Следча-аператыўная група, спецыялісты цэнтральнага апарата Следчага камітэта, а таксама перасовачна-крыміналістычная лабараторыя працавалі на месцы падзей на працягу трох сутак, — удакладніла Юлія Ганчарова. — 36-гадовы бабруйчанін падазраецца ў здзяйсненні злачынства, прадугледжанага часткай 2 артыкула 139 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь. Рыхтуюцца матэрыялы для прад'яўлення яму абвінавачання, праводзяцца следчыя дзеянні, у тым ліку і з падазраваным. Мужчына дае паказанні, дапытваюцца сведкі, назначаны шэраг экспертных даследаванняў, каб высветліць матыў і абставіны здзяйснення злачынства.

Мужчыну пагражае пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі на тэрмін ад васьмі да дваццаці пяці гадоў, або пажыццёвае зняволенне, або смяротнае пакаранне.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

# НІХТО НЕ ПАЦЯРПЕЎ. НА ШЧАСЦЕ...

## Ва Украіне аўтобус з беларусамі вылецеў у кювет

**У Адэскай вобласці беларускі аўтобус кампаніі Ecolines вылецеў у спадзісты кювет. У машыне знаходзіліся 47 пасажыраў, сярод якіх было 20 дзяцей. Ніхто не пацярпеў.**


www.facebook.com/fascija.mashchava

Па словах відавочцаў, аварыя адбылася ўчора раніцай за 135 кіламетраў ад Кіева. Вадзіцель заснуў, з-за чаго аўтобус страціў кіраванне і праз сустрэчную паласу вылецеў у кювет.

«(Кіроўцы. — **Рэд.**) памяняліся пасля мяжы. Першы пайшоў спаць, другі за рулём вырубіўся. Пакуль ехалі па жахлівай дарозе, ён еў цукеркі і трымаўся, а як выехалі на добры кавалак, заснуў», — напісала адна з відавочцаў ДТЗ у сваім Facebook.

Праз дзве з паловай гадзіны пасажырам выдзелілі іншы аўтобус.

— Зараз праводзіцца службовае расследаванне, мы высвятляем прычыны. Думаем, на працягу 3—4 дзён мы ўсё высветлім. У кіроўцы 14-гадовы стаж кіравання, парушэнняў ніколі не было, — расказаў «Звяздзе» **кіраўнік «Ecolines Беларусь» Павел КУЦЭНКА.** На пытанне, ці збіраецца кампанія пакрыць пасажырам нязручнасці, ён адказаў наступнае: «Калі пасажыры звернуцца ў кампанію, мы разгледзім гэтае пытанне».

Нагадаем, на мінулым тыдні рэйсавы мікрааўтобус Адэса—Гомель урэзаўся ў грузавік, пяць беларусаў загінулі. ДТЗ адбылося на 289-м кіламетры аўтадарогі Кіеў—Адэса. У той жа дзень, 20 ліпеня, у ДТЗ пад украінскім Жытомірам загінулі 11 чалавек, нашых суайчыннікаў сярод іх не было.

**Дар'я СПЕВАК**

■ Надвор'е

# Летам у нас як у тропіках

## Уначы духата, а ўдзень дажджы і да плюс 30

**На гэтым тыдні будзе па-ранейшаму цёпла і з дажджамі, паведамілі ў Белгідрамецэ.**

Заўтра ўначы месцамі, а днём на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы, у асобных раёнах моцныя. Месцамі прагрымяць навальніцы. Тэмпература паветра ўначы складзе ад плюс 14 да плюс 19 градусаў, а днём чакаецца 22—28 цяпла. У чацвер істотных змяненняў у надвор'і не чакаецца. Уначы месцамі, удзень на большай частцы тэрыторыі кароткачасовыя дажджы. У асобных раёнах прагрымяць навальніцы. Тэмпература паветра ўначы складзе 12—19 цяпла, а ўдзень ад плюс 21 да плюс 28 градусаў.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных спецыялістаў, у пятніцу ў начныя гадзіны месцамі, днём у многіх раёнах краіны прагназуюцца дажджы, у асобных раёнах з навальніцамі. Тэмпература паветра ўначы складзе 14—20 цяпла, удзень — плюс 24—29 градусаў, месцамі па паўднёвым усходзе — да 30 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# Стыхія ўдарыла па ўсходзе

**Паўднёвы цыклон, які завітаў да нас яшчэ паўтара тыдня таму, працягвае запампоўваць у краіну цёплае паветра і моцныя ападкі. На мінулых выхадных дажджы шчодра палівалі Магілёўскую і Гомельскую вобласці. У Гомелі моцны дождж ліў усю ноч, раніцу і скончыўся толькі пасля поўдня. Па звестках Міністэрства па надзвычайных сітуацыях, усяго на горад абрынулася 72,8 міліметра ападкаў — і гэта пры тым, што месячная норма складае 91 міліметр.**



Жыхары паўмільённага горада выкладвалі ў сацсеткі фота Гомеля, які нечакана ператварыўся ў сапраўдную Венецыю. Шмат дзе аўтамабілі нагадвалі падводныя лодкі — ватэрлінія праходзіла па капоце (і нават вышэй) жалезных коней. У раён Сельмаш з-за гэтага не мог дабрацца працяглы час грамадскі транспарт.

І, натуральна, не абышлося без падтапленняў дамоў. Ратавальнікі адпампоўвалі ваду з падвалаў трох шматкватэрных дамоў, 45 прыватных. Пад удар стыхіі трапілі таксама сярэдняя школа, склад і дзве крамы.

Узяўшы невялікі тайм-аўт, у ноч на панядзелак непагадзь атакавала Магілёўскую вобласць. У прэс-службе МНС паведамілі, што пры сярэднямесячнай норме ў 75 міліметраў ападкаў на абласны цэнтр праліліся 57. Вынік несуцяшальны: вада ўварвалася ў 27 жылых дамоў горада. Чатыры тралейбусныя і пяць аўтобусных маршрутаў не працавалі амаль паўтары гадзіны — кіроўцы чакалі, пакуль ліўнёўка «пераварыць» такі аб'ём ападкаў.

Але яшчэ болей дасталося Касцюковічам. Там выпала ўжо амаль месячная норма ападкаў. Ратавальнікі адпампоўвалі ваду амаль з паўсотні жылых дамоў і 110 гаспадарчых будынкаў. «Паплылі» пяць участкаў дарог і падвал шматкватэрнага дома.

Па папярэдніх прагнозах, дажджы з навальніцамі заханваюцца да выхадных.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

# У Магілёве затапіла не толькі дарогі, але і кватэры

**Моцны лівень, які абрынуўся ў нядзелю вечарам, за лічаныя хвіліны паралізаваў жыццё горада. За кароткі час на Магілёў выпала каля 76 % сярэднямесячнай нормы ападкаў. Некаторыя ўчасткі вуліц сталі наогул непраезнымі. Часова быў прыпынены рух тралейбусаў і аўтобусаў на некаторых маршрутах.**

А вось для жыхароў першага пад'езда дома № 35 па вуліцы Каштанавай гэты дзень запомніцца яшчэ і тым, што вада лілася не толькі за сценамі іх кватэр, але і ўнутры. І прычынай маштабнага патопу стаў зусім не дождж, а няспраўнасць абсталявання і не вельмі высокая аператыўнасць рэагавання адказных службаў. Відавочцы кажуць, што гарачая вада лілася па сценах на працягу амаль гадзіны. Менавіта столькі, па словах жыхароў, прыйшлося чакаць аварыйную службу. У выніку пацярпелі ўсе кватэры — з дзясятага да першага паверха.

Як растлумачылі ў ЖЭУ № 9, на балансе якога знаходзіцца гэты дом, надзвычайная сітуацыя была выклікана тым, што на тэхнічным паверсе выйшаў са строю аўтаматычны паветраадводнік. У выніку маёмасці жыхароў прычынена значная шкода. Людзі ў шоку, шмат хто перад гэтым зрабіў дарагі рамонт і набыў новую мэблю. Вады ж налілося столькі, што ў некаторых кватэрах яна стаяла яшчэ і на наступны дзень. Па словах **начальніка ЖЭУ № 9 Сяргея КАВАЛЬКОВА**, памеры бедства пакуль ацэньваюцца. Складаюцца акты для кампенсацыі страт, якія потым будуць разгледжаны на камісіі Ленінскага ЖРЭУ.

**Нэлі ЗІГУЛЯ**

Сумесны выпуск газеты «Звязда»
і Міністэрства прыродных рэсурсаў
і аховы навакольнага асяроддзя
№ 5 (33)

■ Прыродныя рэсурсы

# КАШТОЎНЫЯ НЕТРЫ

## Пра галоўныя кірункі разведкі карысных выкапняў у краіне

### ВУГЛЕВАДАРОДЫ НА ПАД'ЁМЕ

Нафта па-ранейшаму застаецца адным з найважнейшых для эканомікі Беларусі прыродных рэсурсаў. Таму павышэнню эфектыўнасці яе разведкі і здабычы ўдзяляецца шмат увагі. Сёння ў краіне адкрыта 83 радовішчы нафты, 61 з іх распрацоўваецца, узровень штогадовай здабычы складае каля 1650 мільёнаў тон у год.

— Наша задача — рабіць так, каб штогадовы прырост запасаў быў роўны ці большы за той аб'ём нафты, якая сёння здабываецца, — адзначыў **намеснік міністра прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Андрэй ХМЕЛЬ.** — Гэтага атрымалася дасягнуць у мінулым годзе, на 2018 год таксама стаіць такая задача.

**Сёння ў краіне выяўлена больш за 10 тысяч радовішчаў карысных выкапняў.**

Як расказала **намеснік дырэктара па навуцы філіяла «Інстытут геалогіі» дзяржаўнага прадпрыемства «Навукова-вытворчы цэнтр па геалогіі» Святлана ДЗЯМІДАВА,** прыродная спецыфіка Беларусі ў тым, што вялікую тоўшчу зямной кары складаюць рыхлыя, ці чацвярцічныя, адклады. Вуглевадароды ж знаходзяцца вельмі глыбока і выходзяць на паверхню ў невялікай колькасці месцаў. Таму вывучэнне іх даволі складанае і патрабуе вялікіх выдаткаў.

Але з дапамогай сучасных тэхналогій разведкі і здабычы гэта праца становіцца больш эфектыўнай. Так, па словах **загадчыка лабараторыі геатэктонікі і геафізікі Інстытута прыродакарыстання НАН Беларусі Яраслава ГРЫБІКА,** кампанія «Беларуснафта» праводзіць некаторыя работы па ацэнцы рэсурсаў, якія раней не ўлічваліся з-за сваёй непад'ёмнасці: на старых радовішчах і ўчастках з так званай сланцавай нафтай.

Акрамя тэрыторыі Прыпяцкага прагібу, спецыялісты таксама плануюць больш дэталёва вывучаць і іншыя магчымыя нафтаперспектыўныя ўчасткі — Аршанскую і Падляска-Брэсцкую ўпадзіны.

### БАЗАЛЬТЫ З МЯСЦОВАЙ ПРАПІСКАЙ

У Беларусі недастаткова выкарыстоўваецца ўласная будаўнічая сыравіна, упэўнены Андрэй Хмель. Так, ААТ «Гомельбудматэрыялы» імпартуе для сваёй вытворчасці базальты з Украіны, але ж і ў Беларусі нядаўна былі знойдзены запасы гэтага каменю. Таму сёння Мінпрыроды і Мінархітэктуры працуюць над павелічэннем выкарыстання сыравіны з мясцовых радовішчаў. Спецыялісты двух ведамстваў рыхтуюць аналітычную запіску, якая будзе датычыцца пяску, каменю, базальтаў, кварцавых пяскоў.

— Нам неабходна вывучыць патрэбы будаўнічых і прамысловых прадпрыемстваў у пэўных відах рэсурсаў, ацаніць неабходныя выдаткі, усё разлічыць, абгрунтаваць і накіраваць даныя ў Савет Міністраў, — расказаў Андрэй Хмель. — Сёння мы ацэньваем магчымасці імпартазамяшчэння ў будаўнічай галіне ў $100 мільёнаў.

### АД БУРШТЫНУ ДА САПРАПЕЛЮ

Неабходна больш уважліва ставіцца да такіх прыродных рэсурсаў, як даламіт, сапрапель і трэпел, упэўнены ў Мінпрыроды. Так, даламіт можа выкарыстоўвацца ў земляробстве, сапрапелі — для паляпшэння якасці кармоў для сельскагаспадарчых жывёл, а трэпелы (танкапорыстая асадачная парода) — як дабаўка для прыгатавання камбікармоў, а таксама сыравіна ў хімічнай прамысловасці.


Фота Андрэя ФЕАКЦІСТАВА.

У Беларусі разведана 91 радовішча азёрных сапрапеляў з запасамі больш за 70 мільёнаў тон, а запасы самага вялікага радовішча трэпелаў — Стальное ў Хоцімскім раёне Магілёўскай вобласці — складаюць 30 мільёнаў тон.

— Уцягнуць гэтыя непапулярныя віды рэсурсаў у зварот — адна з задач Мінпрыроды, — адзначыў Андрэй Хмель.

У краіне адрэгулююць пытанні здабычы бурштыну і моранага дубу. Невялікае радовішча бурштыну было адкрыта ў 2016 годзе ў Брэсцкай вобласці — сёння там праводзіцца яго пробная здабыча. У некаторых суб'ектаў гаспадарання ёсць цікавасць і да ўцягнення ў зварот такога дастаткова дарагога матэрыялу, як мораны дуб.

Па словах намесніка міністра, на стадыі ўзгаднення ў рэспубліканскіх органах дзяржкіравання знаходзіцца праект указа, які будзе рэгламентаваць здабычу гэтых рэсурсаў у непрамысловых аб'ёмах.

### ЗОЛАТА — ДЛЯ КАНЦЭСІЯНЕРАЎ

Праяўленні гэтага каштоўнага металу знойдзены падчас пошукавых работ у Стаўбцоўскім раёне: на перспектыўным участку «Зуберава» на глыбіні ад 300 да 500 метраў.

— Работы па пошуку золата праводзіліся ў межах праграмы асваення радовішчаў карысных выкапняў і развіцця мінеральна-сыравіннай базы на 2011—2015 гады, — расказаў **начальнік упраўлення па геалогіі Мінпрыроды Васіль КОЛБ.** — Каб падрыхтаваць радовішча, трэба правесці поўны цыкл геолагаразведачных работ. З гэтымі мэтамі ўчастак унесены ў пералік аб'ектаў, якія прапаноўваюцца для перадачы ў канцэсію. Але пакуль канцэсіянер не знойдзены.

Акрамя золата, у Беларусі ёсць таксама праяўленні медзі і плаціны. Спецыялісты таксама гавораць і пра перспектывы выяўлення радовішчаў уранавых руд, выкарыстання геатэрмальнай энергіі.

**Вераніка КОЛАСАВА.**

**Андрэй ХУДЫК, міністр прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя:**

**— Рэспубліка Беларусь як ніякая іншая краіна багатая на водныя рэсурсы — падземныя і мінеральныя воды. Становішча спраў на рынку мінеральнай і пітной вады гаворыць пра тое, што мы «ходзім па грашах», неэфектыўна выкарыстоўваем гэты рэсурс. Валодаючы ўласнымі рэсурсамі вады, імпартуем яе, не нарошчваем экспарт. Такая ж сітуацыя і з будаўнічай сыравінай. Неабходна павышаць геалагічную вывучанасць тэрыторыі краіны, інтэнсіфікаваць пошук, ацэнку, разведку, здабычу карысных выкапняў.**

■ Міжнароднае супрацоўніцтва

# ГОРНАЯ ГАЛІНА Ў ЛІЧБАВЫМ ФАРМАЦЕ

**Адкрыта папярэдняя рэгістрацыя для ўдзелу ў III Еўразійскім горна-геалагічным форуме, які пройдзе 14—16 лістапада ў Мінску.**




Як расказалі ў прэс-службе Мінпрыроды, удзельнікамі форуму стануць больш за 10 тысяч гарнякоў з 20 краін свету (фарматы ўдзелу — як афлайн, так і анлайн). Акрамя прадстаўнікоў краін ЕАЭС, сёлета мерапрыемства плануюць наведаць і спецыялісты з краін Еўрапейскага саюза, Кітая, Сербіі, В'етнама, Ірана, Індыі і інш.

Галоўная тэма гэтай маштабнай падзеі — «Лічбавізацыя горнай галіны для сумеснага развіцця і працвітання ў Еўразіі».

Удзельнікі мерапрыемства абмяркуюць перспектывы супрацоўніцтва ў сферы лічбавай трансфармацыі горнай галіны; супрацоўніцтва інтэграцыйных аб'яднанняў (ЕАЭС, ШАС, АСЕАН і ААН) у горнай сферы; развіццё крэдытна-фінансавай і транспартнай інфраструктуры сыравінных рынкаў Еўразіі; сінхранізацыю стандартаў класіфікацыі і ўліку карысных выкапняў; бар'еры, выключэнні і абмежаванні на сыравінных рынках рэгіёна. Падчас форуму плануецца таксама наведаць вядучыя горнапрамысловыя прадпрыемствы Беларусі.

Еўразійскі горна-геалагічны форум на сёння — адзіная буйная міждзяржаўная пляцоўка для абмеркавання праблем інтэграцыі рынкаў карысных выкапняў у Еўразіі з удзелам кіраўнікоў выканаўчых органаў улады ў сферы нетракарыстання і найбуйнейшых горнапрамысловых кампаній.

Дадатковая інфармацыя размешчана на афіцыйным сайце форуму www.evrazgeoforum.com.

**Вераніка КОЛАСАВА**

■ Экаадукацыя

# НА ДЫЯЛОГ З ПАВЕТРАМ

## Праект «Зялёныя школы» плануе зрабіць экалагічны маніторынг даступным для ўсіх

**Усім — ад грамадскіх арганізацый да школьнікаў — прыняць удзел у ахове навакольнага асяроддзя хутка стане працэй. У найбліжэйшы час па ўсёй Беларусі запрацуе сем клубаў экалагічнага маніторынгу і адзінаццаць рэсурсных цэнтраў для «зялёных» школ, мэта якіх — далучыць усіх неабыякавых да экалагічных праблем, у першую чаргу забруджвання атмасфернага паветра.**

9 з 10 чалавек сёння дыхаюць брудным паветрам — такія несуцяшальныя лічбы прыводзіць Сусветная арганізацыя аховы здароўя. Шкодныя рэчывы, якія трапляюць у паветра, могуць выклікаць інсульт, рак, знізіць імунітэт і ўплываць на псіхічнае здароўе дарослых і дзяцей. Каб прадухіліць рызыку захворванняў, неабходна праводзіць маніторынг атмасфернага паветра. Але без грамадскасці тут не абысціся, упэўнены спецыялісты. Гэта і стала прычынай старту чатырохгадовага праекта, які арганізатары коратка называюць «Зялёныя школы», афіцыйна ж назва гучыць так: «Далучэнне грамадскасці да экалагічнага маніторынгу і паляпшэнне кіравання аховай навакольнага асяроддзя на мясцовым узроўні».

Адна з галоўных задач праекта — развіццё «зялёнай» адукацыі.

— Мы плануем вельмі цесна працаваць з дзіцячымі садкамі, арганізацыямі дадатковай і дашкольнай адукацыі, школамі. Нават неабавязкова, каб гэтыя ўстановы мелі дыпломы, галоўнае — прытрымлівацца экалагічных прынцыпаў, — падкрэсліла **кіраўнік праекта Вольга ЧАБРОЎСКАЯ.** — Ужо выбраны, напрыклад, першы дзіцячы сад у якасці пілотнага. Таксама мы хочам падключыць людзей з абмежаванымі магчымасцямі. Рэспубліканскі рэабілітацыйны цэнтр для дзяцей-інвалідаў стане першым, дзе мы пратэсціруем праграмы навучання для гэтай катэгорыі насельніцтва.

Дарэчы, у рамках праекта будуць распрацаваны навучальныя і асветніцкія матэрыялы для дзяцей, педагогаў і моладзі. Акрамя гэтага, планецца ўдасканаліць існуючыя і распрацаваць новыя школьныя факультатывы, павысіць кваліфікацыю настаўнікаў па экалагічнай тэматыцы. Каб ахапіць як мага больш людзей, арганізатары створаць сем клубаў і 11 рэсурсных цэнтраў, якія ўкамплектуюць абсталяваннем для маніторынгу паветра. Абапірацца ўся гэта сетка будзе на ўжо існуючыя структуры: мясцовыя ініцыятывы, арганізацыі грамадзянскай супольнасці (АГС), Рэспубліканскі цэнтр экалогіі і краязнаўства, Барысаўскі цэнтр экалогіі і турызму і г. д. Многія з іх маюць вопыт паспяховай працы ў праграме «Зялёныя школы» (рэалізуецца з 2012 года). У ідэале прадугледжана супрацоўніцтва гэтых арганізацый з мясцовымі органамі ўлады.

**Праект фінансуецца Еўрапейскім саюзам і рэалізуецца Праграмай развіцця ААН у Беларусі ў партнёрстве з Міністэрствам прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя.**

— Права на здаровае навакольнае асяроддзе павінна спалучацца з адказнасцю за яго. І тут мала працаваць толькі з прамысловымі прадпрыемствамі, неабходна вучыць наша грамадства прывільнаму дыялогу з суб'ектамі гаспадарання. Пажадана з самага дзяцінства, каб будучае пакаленне было не толькі экалагічна адукаваным, але і экалагічна адказным, — адзначыла **першы намеснік міністра прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Ія МАЛКІНА.** — Таксама неабходна далучаць інстытуты грамадзянскай супольнасці да прыняцця экалагічных рашэнняў і актывізаваць працу на рэгіянальным узроўні ў частцы развіцця «зялёнай» эканомікі. Гэта толькі некаторыя з задач рэалізацыі Мэт устойлівага развіцця, якія Беларусь прасоўвае ў нацыянальную эканоміку.

**Кацярына ЦІТОВА**

■ На сваім месцы

# ПРЫГАЖОСЦЬ НАВАКОЛЛЯ ЯК БРЭНД

## Як у Глыбоцкім раёне ахоўваюць унікальныя краявіды



**Кантраляваць мадэрнізацыю ачышчальных збудаванняў старых прадпрыемстваў, падтрымліваць парадак на сваёй тэрыторыі — гэта толькі малая частка тых задач, якія вырашае Глыбоцкая раённая інспекцыя прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя.**

— Маё меркаванне такое: навядзенне парадку пачынаецца не з афарбоўкі плота, а з больш глабальных пытанняў, — кажа **начальнік інспекцыі Аляксандр КАЗАК**. — У прыватнасці, за апошні час праведзена першая чарга каналізавання горада Глыбокае, пабудаваны і ўжо працуюць ачышчальныя збудаванні з глыбокай біялагічнай ачысткай за кошт крэдытаў Сусветнага банка рэканструкцыі і развіцця. Дзякуючы правядзенню каналізавання ў ААТ «Глыбоцкі аграсэрвіс» спынены выпуск сцёкавых вод у возера Кагальнае, ажыццяўляецца іх скід у гарадскую каналізацыю, чым забяспечваецца нарматыўная ачыстка сцёкавых вод і паляпшэнне якасці паверхневых вод, скарачаецца і аб'ём недастаткова ачышчаных сцёкавых вод. Адбылася таксама маштабная рэканструкцыя цэха сухой сыроваткі УП «Глыбоцкі МКК», таму цяпер малочная сыроватка не трапіць у каналізацыю. Праведзены рамонт ачышчальных збудаванняў з закрыццём выпуску сцёкавых вод у паверхневы водны аб'ект — раку Бярозаўку — у аб'ёме 1262 тыс. $м^3$. Для прадухілення забруджвання падземных вод выкананы ліквідацыйны тампанаж чатырох артэзіянскіх свідравін, якія цяпер не выкарыстоўваюцца.

***— У раёне нямала прамысловых прадпрыемстваў, пабудаваных у той час, калі патрабаванні да экалагічнай бяспекі былі не такія высокія. Якое становішча спраў сёння на гэтых прадпрыемствах?***

— На шасці вытворчых аб'ектах праведзены мерапрыемствы па мадэрнізацыі, аптымізацыі і замене тэхнічна і маральна састарэлага абсталявання, што дазволіла знізіць выкіды шкодных рэчываў у атмасфернае паветра на 1,1 тоны. З усіх прадпрыемстваў раёна найбольшы валавы выкід забруджвальных рэчываў у атмасфернае паветра складаюць аб'екты УП ЖКГ. Асноўныя крыніцы выкідаў — трубы кацельных установак, таму кацельныя цяпер рэканструююцца і мадэрнізуюцца. Сёлета на ААТ «Глыбоцкі камбікормавы завод» праведзена замена трох цыклонаў; заменены вентылятары на аспірацыйнай сістэме, на элеватары заменены састарэлыя маторарэдуктары на стужачных транспарцёрах, што зніжае хуткасць і памяншае выкіды; праведзена замена шлюзавых засавак аспірацыйнай устаноўкі ў адным з цэхаў. Сярод кіраўнікоў прадпрыемстваў, у раённых улад ёсць разуменне таго, што трэба мадэрнізаваць старыя прадпрыемствы, у тым ліку, а часам і перш за ўсё, па экалагічнай лініі.

***— Ці атрымліваецца ў раёна прыцягваць гранты для фінансавання экалагічных праектаў?***

— Так, мы імкнёмся ўдзельнічаць у міжнародных праектах з мэтай вывучэння цікавага вопыту і прыцягнення фінансаў. Напрыклад, у мінулым годзе інспекцыя прымала ўдзел у рабочай групе праекта Еўрасаюза «Садзейнічанне развіццю на мясцовым узроўні ў Рэспубліцы Беларусь. Устойлівае кіраванне цвёрдымі камунальнымі і бытавымі адходамі ў г. п. Падсвілле» ў сувязі з экалагічнай скіраванасцю гэтай праграмы. У выніку рэалізацыі праекта рэкультываваны міні-палігон Воранава, высаджаны чатыры тысячы саянцаў хвоі. Таксама набыта 45 еўракантэйнераў для паасобнага збору адходаў, добраўпарадкавана дзевяць кантэйнерных пляцовак з цвёрдым пакрыццём і агароджай з металапрофілю.

***— На мой погляд турыста, Глыбоцкі раён — адзін з самых добраўпарадкаваных і прыгожых, пачынаючы ад гарадскіх вуліц і завяршаючы прыватнымі падворкамі. Вам, напэўна, нават штрафы не даводзіцца выпісваць нядбайным гаспадарам?***

— На жаль, парушэнні прыродаахоўнага заканадаўства ўсё ж бываюць. Навядзенне парадку на зямлі — адзін з нашых прыярытэтаў, таму з пачатку года праведзены выбарачныя абследаванні 1315 аб'ектаў, у тым ліку 621 сельскагаспадарчага, 72 водных аб'ектаў, 45 міні-палігонаў ЦКА, 320 сельскіх населеных пунктаў. У той жа час хочацца адзначыць сістэматычную працу раённых улад, інспекцыі ў частцы навядзення парадку на зямлі і добраўпарадкавання. Прыгажосць роднай зямлі — гэта, можна сказаць, брэнд нашага раёна. Таму ёсць і пацвярджэнне: па выніках правядзення конкурсу па добраўпарадкаванні і навядзенні парадку на зямлі ў 2013 годзе Глыбокае заняло першае месца ў краіне. Зона адпачынку на возеры Кагальнае ў 2015 годзе заняла першае месца ў Беларусі па добраўпарадкаванні. У 2016 годзе аграгарадок Удзела па добраўпарадкаванні сярод населеных пунктаў 5-й катэгорыі прызнаны адным з найлепшых у краіне. У мінулым годзе Глыбоцкі раён па культуры земляробства заняў першае месца ў Беларусі. Нашы людзі не шкадуюць сіл, сродкаў і фантазіі для добраўпарадкавання, таму што любяць сваю зямлю і хочуць жыць у прыгожым навакольным асяроддзі.

**Аксана ЯНОЎСКАЯ**

■ Па-за працай

**Андрэй ХУДЫК:**

# «Спартакіяда гуртуе калектыў»

## Кіраўнік Мінпрыроды далучае падначаленых да заняткаў спортам




Традыцыйная рэспубліканская гадовая спартакіяда работнікаў арганізацый Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Беларусі прайшла ў Лідзе. Святу моцных і спрытных даў старт **міністр прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Андрэй ХУДЫК.**

«Фізічныя нагрузкі пры разумовай працы для любога чалавека не лішнія, — сказаў міністр. — Заўсёды імкнуўся займацца спортам, каб адчуваць сябе бадзёра. Дзе б ні працаваў, стараўся і калег уцягнуць у заняткі спортам. Мне гэта ўдаецца, людзі праяўляюць цікавасць, актыўна ўдзельнічаюць. Спартакіяда — гэта не толькі спаборніцтвы, імкненне да перамогі, але і нефармальныя зносіны, якія гуртуюць калектыў. Гэта вельмі важна, бо падымае дух, настрой людзей, што станоўчым чынам адаб'ецца і на нашай прафесійнай дзейнасці».

Спаборніцтвы праходзілі па шасці відах спорту: валейбол, більярд, плаванне, настольны тэніс, лёгкаатлетычная эстафета, а таксама стралковае дваябор'е сярод кіраўнікоў. Тытул чэмпіёна спартакіяды ў агульнакамандным заліку заваявалі спартсмены Рэспубліканскага цэнтра дзяржаўнай экалагічнай экспертызы і павышэння кваліфікацыі кіруючых работнікаў і спецыялістаў Мінпрыроды. Сярэбраным прызёрам стала каманда цэнтральнага апарату Мінпрыроды, «бронза» — у Магілёўскага абласнога камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя. У стралковым дваябор'і сярод кіраўнікоў перамогу атрымаў Мікалай Дзядкоў, старшыня Магілёўскага аблкамітэта ПРіАНА, другое месца заваяваў Міхаіл Сіманюкоў, дырэктар Рэспубліканскага цэнтра дзяржаўнай экалагічнай экспертызы і павышэння кваліфікацыі кіруючых работнікаў і спецыялістаў Мінпрыроды, а намеснік міністра Андрэй Хмель заняў трэцюю прыступку п'едэстала гонару.

Разам з Мінпрыроды суарганізатарамі свята бадзёрасці духу і моцнага здароўя выступілі Міністэрства спорту і турызму, Беларускі прафесійны саюз работнікаў лесу і прыродакарыстання.

**Маргарыта ВЯРБІЦКАЯ**

# УВАГА, КОНКУРС!



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Часопіс «Родная прырода» распачынае новы этап конкурсу «Краявіды малой радзімы». Мы чакаем ад вас фотаздымкаў, а таксама вершаў і замалёвак, у якіх вы раскажаце пра сваю малую радзіму. Вынікі конкурсу падвядзём у канцы года. Пераможцы атрымаюць прызы і падарункі.

**Дасылайце свае работы на адрас: 220034, г. Мінск, вул. Захарава, 19 ці на e-mail: pryroda@zviazda.by.**

■ Далучайцеся!

# Ад змянення клімату да біяразнастайнасці

**Мінпрыроды прымае заяўкі прапаноў для рэалізацыі экалагічных праектаў пры фінансавай падтрымцы ГЭФ. Апошні тэрмін іх падачы — 10 жніўня.**

З 1 ліпеня 2018 года пачаўся сёмы фінансавы перыяд работы Глабальнага экалагічнага фонду (ГЭФ), разлічаны на чатыры гады. Да 2022 года на рэалізацыю экалагічных праектаў у Беларусі запланавана накіраваць каля $8,6 млн. Тэматыка праектаў будзе засяроджана на трох прыярытэтных абласцях ГЭФ: змяненні клімату ($5,6 млн), дэградацыі зямель ($1 млн) і біяразнастайнасці ($2 млн). 10 % ад агульнай сумы будзе накіравана на рэалізацыю праектаў у межах Праграмы малых грантаў ГЭФ у нашай краіне.

Як расказалі ў Мінпрыроды, з мэтай фарміравання якаснага партфеля праектных заявак, для рэалізацыі якіх плануецца прыцягнуць сродкі ГЭФ, прыродаахоўнае ведамства стварыла міжведамасную рабочую групу па супрацоўніцтве з фондам пад кіраўніцтвам міністра прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Андрэя Худыка. Яе ўдзельнікі разгледзяць і ацэняць праектныя заяўкі на адпаведнасць нацыянальным прыярытэтам і міжнародным абавязацельствам краіны, узятым у межах шматбаковых экалагічных пагадненняў, і адбяруць найлепшыя з іх.

Прыём праектных прапаноў Мінпрыроды ажыццяўляе з 10 ліпеня па 10 жніўня 2018 г. Усе прапановы павінны быць накіраваны на рашэнне экалагічных задач у прыярытэтных сферах ГЭФ.

Акрамя таго, адзначылі ў Мінпрыроды, для рэалізацыі праектаў у пазначаных тэматычных сферах фінансавая падтрымка ГЭФ будзе аказана атрымальнікам дапамогі пры выдзяленні імі суфінансавання ў памеры 75 % ад агульнага бюджэту праекта.

**Накіроўваць праектныя прапановы можна на адрас: вул. Калектарная, 10, 220004, г. Мінск ці на электронную пошту icd@minpriroda.gov.by з пазнакай ГЭФ-7. Інфармацыю пра дзейнасць ГЭФ і правілы афармлення праектных заявак можна прачытаць на сайце фонду www.thegef.org.**

**Вераніка КОЛАСАВА**

Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

**Извещение о проведении повторного аукциона**

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | РУП «СМТ №22», Витебская обл., г. Полоцк, ул. Шенягина, д. 54. Тел.: + 375 (214) 48-30-01, 48-30-02, 48-30-03 |

**Лот № 1**

Имущество в составе объектов недвижимости, оборудования, материалов, реализуемое одним лотом, в составе:

| Наименование | Общ. пл. | Инв. номер |
|---|---|---|
| **Производственный корпус** | 4234,2 кв. м | 250/D-36006 |
| Адрес: Витебская обл., Полоцкий р-н, Экиманский с/с, 23-2, в 0,3 км к востоку от д. Ксты | | |
| **Обременения** Договор аренды. Подробная информация на сайте www.cpo.by | | |
| **Канализационная насосная станция ливневая** (составные части и принадлежности: подземная часть, бетонное покрытие (2833 кв. м); ограждение (панели железобетонные) длиной 193,2 м; ограждение (кирпичи) длиной 9,6 м; дороги и проезды заводской территории наружной площадью 159 кв. м (покрытие бетонное; плиты железобетонные); ворота (1/2 часть) | 223,1 кв. м | 250/C-34540 |
| Адрес: Полоцкий р-н, Экиманский с/с, 23Г, в 0,3 км к востоку от д. Ксты | | |
| **Сведения о земельном участке** Для обслуживания здания канализационной насосной станции предоставлен участок на праве постоянного пользования общ. пл. 0,6463 га | | |
| **Внеплощадочная канализационная сеть ливневая** (Составные части и принадлежности: участок сети (трубопровод напорный от КНС (ливневой) до К1, колодец К1, трубопровод безнапорный от К1 до К) | 785 м | 250/C-39078 |
| Адрес: Витебская обл., Полоцкий р-н, Экиманский с/с, 12 в 0,3 км к востоку от д. Ксты, внеплощадочная канализационная сеть ливневая от КНС (ливневой) до колодца в г. Полоцке, р-н ул. Строительной, 30/6 | | |
| **Сеть ливневой канализации** (Составные части и принадлежности: сеть ливневой канализации, в т. ч. трубопровод безнапорный, 87 колодцев, 12 дождеприемников, 25 выпусков.) | 2160,5 м | 250/C-36840 |
| Адрес: Витебская обл., Полоцкий р-н, Экиманский с/с, в 0,3 км к востоку от д. Ксты, сеть ливневой канализации | | |

**В состав лота входит следующее оборудование:**
Насос ФГГ 50/12,5, инв. № 05150, насос ФГГ 50/12,5, инв.№ 05151, насос ФГГ 50/12,5, инв. № 05152, мост. кран16-5к-22.5-16-У3, инв. № 02244, мост. кран16-5к-22.5-16-У3, инв. № 02245, электротельфер канатный 0,5т, б/н, насос «Гном», б/н

С перечнем материальных запасов (сырье, материалы, инвентарь), входящих в состав предмета аукциона, можно ознакомиться на сайте организатора аукциона WWW.CPO.BY

**Начальная цена с НДС 20 %: 286 966,87 белорусского рубля**
**Шаг аукциона: 14 348,35 белорусского рубля**

**Порядок ознакомления по лоту № 1:** осуществляется в рабочие дни с 9.00 до 16.00, перерыв с 12.00 до 13.00. Ответственное лицо: Мысник Наталья Васильевна, заместитель управляющего, тел. +375 (29) 5163232

**Лот № 2**

| Наименование | Общ. пл. | Инв. номер |
|---|---|---|
| **Производственный корпус** (составные части и принадлежности: общее благоустройство территории – забор (кирпич), две калитки, забор (металл), забор (панели железобетонные – 24,0 м и 280,9 м), дороги и проезды заводской территории, покрытие бетонное, плиты железобетонные) | 5694,7 кв. м | 250/D-36976 |
| Адрес: Витебская обл., Полоцкий р-н, Экиманский с/с, 12-1, в 0,3 км к востоку от д. Ксты | | |

**В состав лота входит следующее оборудование:**

| Наименование | Инв. № | Наименование | Инв. № |
|---|---|---|---|
| Кран мостовой электрический однобалочный Л-595 | 41070 | Кран мостовой 16-5К-22,5 | 41071 |

С перечнем оборудования, материальных запасов (сырье, материалы, инвентарь), входящих в состав предмета аукциона, можно ознакомиться на сайте организатора аукциона WWW.CPO.BY

**Обременения** Договор аренды. Подробная информация на сайте www.cpo.by

**Начальная цена с НДС 20 %: 1 150 522,04 белорусского рубля**
**Шаг аукциона: 57 526,10 белорусского рубля**

**Лот № 3**

| Наименование | Общ. пл. | Инв. номер |
|---|---|---|
| **Производственный корпус** (Составные части и принадлежности: бетоносмесительный цех, склад готовой продукции; общее благоустройство территории – забор (кирпич), две калитки, забор (металл), забор (панели железобетонные – 24,0 м и 280,9 м), дороги и проезды заводской территории, покрытие бетонное, плиты железобетонные) | 11371,2 кв. м | 250/D-36977 |
| Адрес: Витебская обл., Полоцкий р-н, Экиманский с/с, 12-2, в 0,3 км к востоку от д. Ксты | | |
| **Внутриплощадочная канализационная сеть** (Составные части и принадлежности: трубопровод, безнапорный, трубопровод, 45 колодцев, 4 дождеприемника, 17 выпусков) | 1707,0 м | 250/C-37674 |
| Адрес: Витебская обл., Полоцкий р-н, Экиманский с/с,12, в 0,3 км к востоку от д. Ксты, канализационная сеть | | |
| **Обременения** Договор аренды. Подробная информация на сайте www.cpo.by | | |

**В состав лота входит следующее оборудование:**

| Наименование | Инв. № | Наименование | Инв. № |
|---|---|---|---|
| Кран мостовой 16-5К-22,5 | 41067 | Кран мостовой 16-5К-22,5 | 41068 |
| Кран мостовой 16-5К-22,5 | 41069 | Кран мостовой 16-5К-22,5 | 41058 |
| Трансформаторная подстанция ТМ-1000 | 40036 | Трансформаторная подстанция ТМ-1000 | 40037 |
| Подмости шарнирно-панельные | 07403 | Подмости шарнирно-панельные | 07404 |
| Формы для изготовления бетонных образцов 100*100 (5 компл. по 2 шт.) | 44102 | Формы для изготовления бетонных образцов 100*100 (2 компл. по 3 шт.) | 44106 |

С перечнем оборудования, материальных запасов (сырье, материалы, инвентарь), входящих в состав предмета аукциона, можно ознакомиться на сайте организатора аукциона WWW.CPO.BY

**Начальная цена с НДС 20 %: 2 054 737,69 белорусского рубля**
**Шаг аукциона: 102 736,89 белорусского рубля**

**Лот № 4**

| Наименование | Общ. пл. | Инв. номер |
|---|---|---|
| **Складское помещение** (составные части и принадлежности: рампа (59/100); общее благоустройство территории – забор (кирпич), две калитки, забор (металл), забор (панели железобетонные – 24,0 м и 280,9 м), дороги и проезды заводской территории, покрытие бетонное, плиты железобетонные) | 970,8 кв. м | 250/D-36978 |
| Адрес: Витебская обл., Полоцкий р-н, Экиманский с/с, 12-3, в 0,3 км к востоку от д. Ксты | | |

**В состав лота входит следующее оборудование:**

| Наименование | Инв. № | Наименование | Инв. № |
|---|---|---|---|
| Нивелир С-330 | 00081 | Нивелир С-330 | 00519 |
| Аппарат сварочный АС-150 | 42017 | Трансформатор ТДМ-403 У2 | 00482 |
| Инвертор сварочный ZX7-160 | 00480 | Блок снижения напряжения БСН1СУ3 | 00489 |
| Насос «Гном» 16*16 | 00487 | | |

С перечнем оборудования, материальных запасов (сырье, материалы, инвентарь), входящих в состав предмета аукциона, можно ознакомиться на сайте организатора аукциона WWW.CPO.BY

**Начальная цена с НДС 20 %: 93 253,79 белорусского рубля**
**Шаг аукциона: 4 662,69 белорусского рубля**

**Лот № 5**

| Наименование | Общ. пл. | Инв. номер |
|---|---|---|
| **Складское помещение** (составные части и принадлежности: рампа (41/100); общее благоустройство территории – забор (кирпич), две калитки, забор (металл), забор (панели железобетонные – 24,0 м и 280,9 м), дороги и проезды заводской территории, покрытие бетонное, плиты железобетонные) | 683,5 кв. м | 250/D-36979 |
| Адрес: Витебская обл., Полоцкий р-н, Экиманский с/с, 12-4, в 0,3 км к востоку от д. Ксты | | |

**В состав лота входит следующее оборудование:** линия по производству блоков из ячеистого бетона, инв. № 41080

**Начальная цена с НДС 20 %: 66 006,00 белорусского рубля**
**Шаг аукциона: 3 300,30 белорусского рубля**

**Лот № 6**

| Наименование | Общ. пл. | Инв. номер |
|---|---|---|
| **Производственное помещение** (составные части и принадлежности: общее благоустройство территории – забор (кирпич), две калитки, забор (металл), забор (панели железобетонные – 24,0 м и 280,9 м), дороги и проезды заводской территории, покрытие бетонное, плиты железобетонные) | 551,6 кв. м | 250/D-36980 |
| Адрес: Витебская обл., Полоцкий р-н, Экиманский с/с, 12-5, в 0,3 км к востоку от д. Ксты | | |
| **Обременения:** Договор аренды. Подробная информация на сайте www.cpo.by | | |

С перечнем оборудования, материальных запасов (сырье, материалы, инвентарь), входящих в состав предмета аукциона, можно ознакомиться на сайте организатора аукциона WWW.CPO.BY.

**Начальная цена с НДС 20 %: 66 384,39 белорусского рубля**
**Шаг аукциона: 3 319,22 белорусского рубля**

**Лот № 7**

| Наименование | Общ. пл. | Инв. номер |
|---|---|---|
| **Складское помещение** (составные части и принадлежности: общее благоустройство территории – забор (кирпич), две калитки, забор (металл), забор (панели железобетонные – 24,0 м и 280,9 м), дороги и проезды заводской территории, покрытие бетонное, плиты железобетонные) | 709,4 кв. м | 250/D-36981 |
| Адрес: Витебская обл., Полоцкий р-н, Экиманский с/с, 12-6, в 0,3 км к востоку от д. Ксты | | |
| **Обременения** Договор аренды. Подробная информация на сайте www.cpo.by | | |

**Начальная цена с НДС 20 %: 80 820,00 белорусского рубля**
**Шаг аукциона: 4 041,00 белорусского рубля**

**Лот № 8**

| Наименование | Общ. пл. | Инв. номер |
|---|---|---|
| **Складское помещение** (составные части и принадлежности: общее благоустройство территории – забор (кирпич), две калитки, забор (металл), забор (панели железобетонные – 24,0 м и 280,9 м), дороги и проезды заводской территории, покрытие бетонное, плиты железобетонные) | 364,9 кв. м | 250/D-36982 |
| Адрес: Витебская обл., Полоцкий р-н, Экиманский с/с, 12-7, в 0,3 км к востоку от д. Ксты | | |

С перечнем оборудования, материальных запасов (сырье, материалы, инвентарь), входящих в состав предмета аукциона, можно ознакомиться на сайте организатора аукциона WWW.CPO.BY

**Начальная цена с НДС 20 %: 47 459,68 белорусского рубля**
**Шаг аукциона: 2 372,98 белорусского рубля**

**Лот № 9**

| Наименование | Общ. пл. | Инв. номер |
|---|---|---|
| **Складское помещение со стоянкой для автомашин** (Составные части и принадлежности: общее благоустройство территории – забор (кирпич), две калитки, забор (металл), забор (панели железобетонные – 24,0 м и 280,9 м), дороги и проезды заводской территории, покрытие бетонное, плиты железобетонные) | 1093,7 кв. м | 250/D-36983 |
| Адрес: Витебская обл., Полоцкий р-н, Экиманский с/с, 12-8, в 0,3 км к востоку от д. Ксты | | |
| **Обременения** Договор аренды. Подробная информация на сайте www.cpo.by | | |

**Начальная цена с НДС 20 %: 119 640,00 белорусского рубля**
**Шаг аукциона: 5 982,00 белорусского рубля**

**Лот № 10**

| Наименование | Общ. пл. | Инв. номер |
|---|---|---|
| **Складское помещение** (составные части и принадлежности: общее благоустройство территории – забор (кирпич), две калитки, забор (металл), забор (панели железобетонные – 24,0 м и 280,9 м), дороги и проезды заводской территории, покрытие бетонное, плиты железобетонные) | 190,3 кв. м | 250/D-36984 |
| Адрес: Витебская обл., Полоцкий р-н, Экиманский с/с, 12-9, в 0,3 км к востоку от д. Ксты | | |

**Начальная цена с НДС 20 %: 24 960,00 белорусского рубля**
**Шаг аукциона: 1 248,00 белорусского рубля**

**Порядок ознакомления по лотам №№ 2–10:** осуществляется в рабочие дни с 9.00 до 16.00, перерыв с 12.00 до 13.00. Ответственное лицо: Мысник Наталья Васильевна, заместитель управляющего, тел. +375 (29) 5163232

**Транспорт, спецтехника и оборудование, расположенные по адресу:** Витебская область, Полоцкий район, Экиманский с/с, 0,3 км к востоку от д. Ксты, в составе:

| Лот № | Инв. № | Наименование предмета аукциона, год выпуска | Начальная стоимость, бел. руб. с учетом НДС | Шаг аукциона, бел. руб. с учетом НДС |
|---|---|---|---|---|
| 11 | 01153 | Автомобиль ГАЗ 31105 2224ВА-2 | 1 037,60 | 51,88 |
| 12 | 02218 | Кран башенный БМ-401П | 47 976,00 | 2 398,80 |
| 13 | 03454 | Дизмолот сваебойный МСДШ | 3 792,00 | 189,60 |
| 14 | 31800 | Агрегат сварочный АДД 4002 М2, 2006 г. в. | 1 056,00 | 52,80 |
| 15 | 31801 | Агрегат сварочный АДД 4003, 2000 г. в. | 912,00 | 45,60 |
| 16 | 05063 | Дистиллятор | 60,00 | 3,00 |
| 17 | 00086 | Измеритель дымности отработавших газов МЕТА-01 МП.01, 2009 г. | 118,60 | 5,93 |
| 18 | 31798 | Сварочный аппарат JASIC ARC-140, 2007 г. в. | 9,60 | 0,48 |
| 19 | 05071 | Станок шлифовальный 3К-634, 1987 г. в. | 60,00 | 3,00 |
| 20 | 31816 | Трансформатор ТДМ-403 У2 | 64,80 | 3,24 |
| 21 | 41227 | Автоматический станок для резки штапика CKY-501 | 582,60 | 29,13 |
| 22 | 42021 | Выпрямитель дуговой сварки ВДМ-1202С, 2007 г. | 273,00 | 13,65 |
| 23 | 47228 | Комплект тензометрии BSS-2t с индикатормCi 6001 | 38,40 | 1,92 |
| 24 | 47197 | Машина испытательная ИП-100, 1994 г. в. | 1 011,60 | 50,58 |
| 25 | 40221 | Парогазогенератор ПГГ-2 | 864,00 | 43,20 |
| 26 | 40015 | Сварочный аппарат ВДМ-1201,1991 г. | 184,80 | 9,24 |
| 27 | 41228 | Станок для зачистки углов профиля КТ-504/2, 2009 г. | 1 212,00 | 60,60 |
| 28 | 41044 | Станок настольно-сверлильный ВШ-029 | 696,00 | 34,80 |
| 29 | 41048 | Станок правильно-отрезной СМЖ 357К | 792,00 | 39,60 |
| 30 | 44095 | Станок шлифовальный 3К-1334 | 184,80 | 9,24 |
| 31 | 00464 | Трансформатор сварочный ТДМ-252 У2 | 74,40 | 3,72 |
| 32 | 41065 | Установка горизонтальная СМЖ-54А | 1 608,00 | 80,40 |
| 33 | 40024 | Установка прогрева бетона КТП ТО 80-86 У1, 1996 г. в. | 275,40 | 13,77 |
| 34 | 70223 | Шкаф металлический, 2000 г. в. | 53,60 | 2,68 |
| 35 | 8911 | Блок-контейнер | 729,20 | 36,46 |
| 36 | 04131 | Штукатурная станция СШ-6 | 984,00 | 49,20 |
| 37 | 00485 | Блок снижения напряжения БСН 1 СУ3, 2008 г. в. | 57,60 | 2,88 |
| 38 | 00486 | Блок снижения напряжения БСН 1 СУ3, 2008 г. в. | 57,60 | 2,88 |
| 39 | 01138 | Станция прогрева бетона ТСД 3-80/0,38 У3 | 613,80 | 30,69 |
| 40 | 01139 | Станция прогрева бетона ТСД 3-80/0,38 У3 | 613,80 | 30,69 |
| 41 | 00490 | Трансформатор НТС 2.5У, 2011 г. в. | 31,20 | 1,56 |
| 42 | 00491 | Трансформатор НТС 2.5У, 2011 г. в. | 31,20 | 1,56 |
| 43 | 00463 | Трансформатор ТДМ-403У2, 2008 г. в. | 64,80 | 3,24 |
| 44 | 01130 | Установка для приготовления и выдачи раствора УПР-3 | 2 224,80 | 111,24 |

**С подробной информацией по предмету аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона WWW.CPO.BY**

**Порядок ознакомления:** осуществляется в рабочие дни с 9.00 до 16.00, перерыв с 13.00 до 14.00. **По лотам №№ 11–36** ответственное лицо: Зызников Виктор Иванович, заведующий базой, тел. +375 33 6774509. **По лотам №№ 37–44** ответственное лицо Свердлов Михаил Данилович, ведущий энергетик, тел. +375 29 5163113

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с **BY60BLBB30120191021390001001** в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 10** (десять) рабочих дней после проведения аукциона

**Срок оплаты: По лотам №№ 1–10:** не более 30 (тридцати) дней со дня заключения договора купли-продажи (если иное не предусмотрено договором купли-продажи).
**По лотам №№ 11–44** при цене продажи предмета аукциона в сумме до 49 999,99 BYN – срок оплаты не более **10** (десяти) дней со дня заключения договора купли-продажи. При цене продажи предмета аукциона в сумме свыше 50 000,00 BYN – срок оплаты не более **20** (двадцати) дней со дня заключения договора купли-продажи

**Порядок оформления участия в аукционе и результатов торгов:** аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совмина РБ от 8 января 2013 г. № 16 «О некоторых вопросах продажи имущества ликвидируемого юридического лица». К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору аукциона в указанный в извещении срок заявление с приложением всех необходимых документов, зарегистрированное в журнале регистрации заявлений на участие в торгах, и заключившие с организатором торгов договор о задатке. С подробной информацией о перечне предоставляемых документов, образцами заявления на участие в аукционе и договора о задатке, а также правилами проведения аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона WWW.CPO.BY

В случае признания торгов несостоявшимися в связи с тем, что заявление на участие в них было подано только одним участником либо для участия в них явился только один участник, возможна продажа предмета торгов этому участнику по начальной цене, увеличенной на 5 %

**Затраты** на организацию и проведение торгов возмещаются организатору аукциона участником торгов, с которым заключается договор купли-продажи в течение 5 дней со дня проведения торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в г. «Звязда» 29.06.2018 г.

**Дата и время проведения аукциона: 10.08.2018 в 13.00 по адресу: РУП «СМТ № 22», Витебская обл., г. Полоцк, ул. Шенягина, д. 54, актовый зал**

**Дата и время окончания приема документов: 08.08.2018** до 17.00 по адресу: г. **Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»**

**Контактные телефоны: +375 17 280-36-37; +375 29 317-95-42. Email: auction@cpo.by**

# МЕТР «АДВЯЖУЦЬ» АД ДОЛАРА. КАНЧАТКОВА

## Дакумент аб гэтым можа быць прыняты ўжо ў кастрычніку



**У нашай краіне плануецца забараніць заключэнне дагавораў долевага будаўніцтва ў замежнай валюце. Гэтую інфармацыю агучыла начальнік аддзела рэгулявання жыллёвай палітыкі Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва Таццяна ЗАТУРЭНСКАЯ.**

Змены ва Указ № 263 аб долевым будаўніцтве прадугледжваюць норму, згодна з якой будзе выключаная магчымасць дагавораў, якія датычацца як жылых, так і нежылых памяшканняў, з прывязкай да валюты. Таццяна Затурэнская прызналася, што забудоўшчыкам гэтая прапанова не вельмі спадабалася. Але ў цэлым яе ўсе прынялі ў рамках палітыкі дэдаларызацыі.

**«Арыенціровачна сярэдні кошт квадратнага метра жылля, пабудаванага з дзяржпадтрымкай, складае 800 рублёў. Думаю, што да канца года ён не павялічыцца».**

«Мы ў найбліжэйшы час уносім праект на разгляд ва ўрад і далей кіраўніку дзяржавы. Да кастрычніка дакумент, магчыма, будзе прыняты», — сказала Таццяна Затурэнская.

Адказваючы на пытанне, ці зменіцца кошт квадратнага метра ў сувязі з новаўвядзеннем, прадстаўнік Мінбудархітэктуры падкрэсліла, што пры вызначэнні яго кошту забудоўшчык улічвае прагнозны індэкс інфляцыі на дату заключэння дагавора. «Беларускі рубель досыць стабільны. Калі і далей Нацыянальны банк будзе праводзіць такую ж макраэканамічную палітыку ў адносінах да нацыянальнай валюты, мы не бачым праблем, якія могуць паўстаць у працэсе будаўніцтва», — дадала яна. Змены ў дзеючы ўказ аб долевым будаўніцтве ў цэлым закліканы дадаткова ўрэгуляваць адносіны заказчыкаў, забудоўшчыкаў і падрадчыкаў, зыходзячы з напрацаванай праваапрымяняльнай практыкі.

### ЖЫЛЛЁ З ДЗЯРЖПАДТРЫМКАЙ — ШМАТДЗЕТНЫМ

Паводле аператыўных даных, са студзеня да чэрвеня сёлета дзяржпадтрымкай пабудавана 41,6 % дамоў ад запланаванага аб'ёму. Усяго на год па гэтай катэгорыі плануецца пабудаваць 900 тысяч квадратных метраў агульнай плошчы. А агульны аб'ём будаўніцтва жылля ўсіх катэгорый на год — гэта чатыры мільёны квадратных метраў, з якіх цяпер гатова толькі каля 42 %.

Амаль усё жыллё, уведзенае па Указе № 240 аб адрасным субсідзіраванні будаўніцтва жылля, выдзяляецца шматдзетным сем'ям. Указ прагрэсіўны, ён прадугледжвае аказанне дзяржпадтрымкі непасрэдна грамадзянам. «Аднак агульная чарга рухаецца вельмі павольна, колькасць шматдзетных сем'яў пастаянна расце. Гэта сведчыць пра тое, што дэмаграфічная сітуацыя паляпшаецца», — дадала прадстаўнік Мінбудархітэктуры.

З пачатку гэтага года па ўказе складзена 6290 крэдытных дагавораў, у тым ліку 1959 — з індывідуальнымі забудоўшчыкамі. Адкрыта крэдытных ліній на больш чым 317,7 млн рублёў, выдадзена крэдытаў на суму амаль 224,6 млн рублёў. У стадыі будаўніцтва знаходзяцца 142 жылыя дамы, з іх уведзена ў эксплуатацыю 63 жылыя аб'екты.

«У работу ўключылася дастатковая колькасць камерцыйных банкаў», — адзначыла Таццяна Затурэнская. Сёлета крэдытаванне чаргавікоў па Указе № 240 прадугледжана Беларусбанкам, Белаграпрамбанкам, БПС-Ашчадбанкам, Прыорбанкам, Белінвестбанкам і банкам БелВЭБ.

Працягваюць ужываць і Указ № 13. Па ім даюцца льготныя крэдыты ў аб'ёме толькі зваротных сродкаў для тых, хто атрымліваў крэдыты раней. Дзеянне гэтага ўказа будзе заканчвацца, але адмяняць яго ніхто не плануе.

«Арыенціровачна сярэдні кошт квадратнага метра жылля, пабудаванага з дзяржпадтрымкай, складае 800 рублёў. Думаю, што да канца года ён не павялічыцца», — заявіла начальнік аддзела.

### САМАЯ ДОЎГАЯ ЧАРГА — У СТАЛІЦЫ

Па звестках Мінгарвыканкама, агульная чарга маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў складае 199 858 сем'яў. З іх 5578 — шматдзетныя. З 2012 года было прыпынена фарміраванне жыллёвых кааператываў і гэта вельмі ўскладніла сітуацыю для ўсіх чаргавікоў.

Зараз з усіх шматдзетных чаргавікоў 793 практычна вырашаюць сваё кватэрнае пытанне, а астатнія толькі чакаюць. Са звычайных чаргавікоў сёлета на паляпшэнне пакуль не накіравана ні адна сям'я.

З шматдзетнымі ёсць яшчэ адна праблема. Вядома, ім лепш за ўсё мець 4-пакаёвую кватэру. Але за тры гады ў Мінску іх пабудавана толькі 14. Таму адну шматдзетную сям'ю ўлады імкнуцца накіраваць адразу на дзве кватэры. Звычайна гэта кватэры з агульным тамбурам. Трэба ўлічыць пры гэтым, што ў мінскай чарзе ёсць 139 сем'яў, дзе чацвёра і больш дзяцей. Іх пытанне ўладам неабходна вырашаць у першую чаргу. Таму такія сем'і імкнуцца накіроўваць, куды толькі атрымліваецца. Калі прымальна для людзей, то ім прапануюць і камерцыйныя варыянты.

Паводле прагнозу сталічных уладаў, сёлета яшчэ 300—350 шматдзетных сем'яў сыдуць з чаргі за кошт будаўніцтва новых дамоў. А за 3—3,5 года Мінгарвыканкам спадзяецца з большага разгрузіць «шматдзетную» чаргу, якая сабралася прыкладна за апошнія 5—6 гадоў.

### З МІНСКА Ў СМАЛЯВІЧЫ БЕЗ ЧАРГІ

Мінбудархітэктуры падрыхтавала праект указа аб рэалізацыі інвестыцыйнага праекта па будаўніцтве эксперыментальнага жылога дома ў Смалявічах. Праект указа ўжо ўзгоднены зацікаўленымі бакамі. «Мяркуецца, што ў Смалявічы будуць перасяляцца грамадзяне, якія стаяць на ўліку маючых патрэбу ў Мінску, — сказала Таццяна Затурэнская. — Як паказаў папярэдні аналіз сітуацыі, дастатковая колькасць такіх грамадзян з задавальненнем перададуць у гэты горад пры ўмове выдзялення ім дзяржаўнай падтрымкі па Указе № 240».

Мінчане, якія пераехалі на пастаяннае месца жыхарства ў Смалявічы, будуць атрымліваць дзяржпадтрымку без уліку часу пастаноўкі на ўлік для паляпшэння жыллёвых умоў. Мінск будзе фарміраваць пералік жыхароў эксперыментальнага дома, у гэты пералік могуць увайсці і тыя, хто стаў на чаргу ўсяго год таму.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# Рэгістрацыя нерухомасці па новых правілах

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Хоць, як і раней, рэгістраваць нерухомасць будуць упаўнаважаныя на гэта рэгістратары арганізацый па нерухомасці, аўтаразаваныя пасрэднікі змогуць займацца некаторымі іншымі, звязанымі з працэдурай дзеяннямі. Напрыклад, складаць заяву аб дзяржаўнай рэгістрацыі, рыхтаваць дакумент аб унясенні адзнак і выпраўленняў у рэгістр нерухомасці, збіраць іншыя афіцыйныя паперы, рабіць іх копіі, накіроўваць паперы рэгістратару.

Быць пасрэднікам могуць суб'екты, якія найбольш часта працуюць з нерухомасцю: натарыусы, адвакаты, рыэлтары і нават забудоўшчыкі.

— Каб зарэгістраваць, напрыклад, узнікненне правоў на нерухомасць, павінны быць дакументы, якія стануць падставай для гэтага. Тая ж даведка ад забудоўшчыка аб прыналежнасці чалавеку кватэры. Стаўшы пасрэднікамі, адпаведныя арганізацыі змогуць адразу аказваць грамадзянам комплексную паслугу, — растлумачыў **юрыст Сяргей ЕЛІСЕЕЎ**. — Шляхам электроннага ўзаемадзеяння яны накіруюць патрэбныя паперы рэгістратару і аддадуць чалавеку гатовы дакумент аб рэгістрацыі. Гэта выгадна ўсім. Чалавек не згубіць час, абыходзячы ўсе інстанцыі, рэгістратары ўздыхнуць лягчэй, бо ў іх вельмі вялікая загружанасць, асабліва ў сталіцы. А пасрэднік зможа такім чынам зарабіць дадатковыя грошы.

Цану на пасрэдніцкія паслугі, на думку эксперта, будуць вызначаць самі пасрэднікі, аднак наўрад ці гэта будуць надта вялікія сумы. Дзейнасць аўтарызаваных пасрэднікаў і, магчыма, у тым ліку і кошт паслуг, будзе рэгламентавацца адпаведнай інструкцыяй Дзяржаўнага камітэта па маёмасці Беларусі.

### Сведчыш — дзе жывеш, рэгіструеш — дзе набыў дом

Экстэрытарыяльнасць — яшчэ адно новаўвядзенне Закона. З 22 ліпеня засведчваць дакументы аб здзелцы з нерухомасцю, якія патрэбны для рэгістрацыі, можна ў любой арганізацыі па дзяржаўнай рэгістрацыі нерухомасці па жаданні чалавека, а не як раней — толькі ў арганізацыі па месцы знаходжання нерухомасці. А вось рэгістраваць яе па-ранейшаму трэба толькі ў рэгіструючых органах па месцы знаходжання маёмасці.

— Калі мінчанін набывае кватэру, напрыклад, у Віцебску, ён разам з прадаўцом можа пайсці да рэгістратара ў сталіцы і засведчыць дагавор пакупкі. А ўжо потым даслаць яго рэгістратару ў Віцебску. Гэта можна зрабіць самастойна або заказаць дадатковую паслугу ў той жа арганізацыі, дзе засведчвалі дагавор пакупкі. І сталічны рэгістратар накіруе дакумент рэгістратару ў Віцебску. Гэта эканоміць і час, і грошы, бо чалавеку не трэба самому выязджаць па месцы знаходжання дома, і ён не сутыкнецца з тым, што рэгістрацыйнае бюро раптам будзе зачынена. У маленькіх гарадках яно можа працаваць увогуле раз на тыдзень, — падкрэсліў плюсы экстэрытарыяльнасці юрыст. — Гэтая норма карысная менавіта звычайным грамадзянам. Суб'ектам гаспадарання, якія праводзяць здзелкі з нерухомасцю, у прынцыпе не трэба было сведчыць дагаворы, а толькі рэгістраваць іх.

Акрамя таго, на дакументах для дзяржаўнай рэгістрацыі здзелкі з нерухомасцю, якая заключаецца юрыдычнымі асобамі, індывідуальнымі прадпрымальнікамі і дзяржаўнымі органамі, пячатка цяпер увогуле непатрэбная. Такое рашэнне, пэўна, звязана з Дэкрэтам Прэзідэнта № 7 «Аб развіцці прадпрымальніцтва», які дазваляе суб'ектам гаспадарання не выкарыстоўваць пячаткі, лічаць эксперты.

### Пяць дзён замест тыдня

Мяняюцца таксама тэрміны працэдуры рэгістрацыі. З 22 ліпеня рэгістраваць нерухомасць будуць на працягу пяці працоўных дзён з дня прыёму дакументаў. Да гэтага рэгістрацыя магла адбывацца на працягу сямі працоўных дзён з дня падачы дакументаў. Як і раней, паскорана за дадатковую плату зрабіць гэта можна за два дні, а тэрмінова — за дзень.

Змяніўся і час для прадстаўлення дадатковых звестак дзяржаўнымі органамі і іншымі дзяржарганізацыямі, неабходных для дзейнасці рэгістратараў.

— Тэрмін адказу на гэты запыт цяпер складае пяць працоўных дзён замест сямі каляндарных, — дадаў юрыст.

Каб дакладна зразумець дзеянне гэтых і іншых новаўвядзенняў закона, лепш усё ж кансультавацца са спецыялістамі, бо нейкія асобныя моманты самастойна ў дакуменце можна і не заўважыць.

**Ірына СІДАРОК.**

# Капліца з адмысловым гадзіннікам і электроннымі званамі

**...нарэшце з'явіцца ў Гомелі. Тры гады для яе шукалі годнае месца, і вось цяпер прынята рашэнне, што яна будзе знаходзіцца насупраць маторарамонтнага завода на праспекце Кастрычніка.**



Архіепіскап Гомельскі і Жлобінскі Сцяфан асвяціў камень у падмурку будучай капліцы. Пабудову з адмысловым гадзіннікам плануюць узвесці за тры месяцы. Капліца, згодна з праектам, будзе 13 метраў у вышыню. Сцены з цэглы абліцуюць дэкаратыўным матэрыялам, першыя два ярусы ўпрыгожаць пано з выявамі святых Манефы Гомельскай, Іаана Кармянскага і іншых святых, якія асабліва шануюцца ў рэгіёне. На верхнім ярусе ўсталююць чатыры цыферблаты і электронна-механічны званар, які дазваляе званам гучаць без удзелу чалавека. Для абслугоўвання механізма ўсярэдзіне будынка змантуюць лесвіцу. Заказчыкам выступае маторарамонтны завод. Заканчэнне будаўніцтва прызначана на верасень гэтага года.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

# «ГЭТА НЕ ПАМЫЛКА...»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Людзі пісалі на камянях, пакідалі «аўтографы» на будынках і сценах храмаў. Самы знакаміты беларускі асветнік Францыск Скарына таксама выдаваў свае кнігі з яўным намерам зрабіць друкаваныя кнігі больш даступнымі для чытача «сярэдняй заможнасці». Можна меркаваць, што спецыяльна «для навучання люду паспалітага» ён друкаваў кнігі асобнымі выпускамі, драбніў іх на невялікія часткі. Такім чынам, іх набывалі купцы і святары, гараджане, мяшчане, вайскоўцы — прадстаўнікі не самых «высокіх» прафесій.

І ўсё ж такі была вялізная патрэба ў кнізе, якая б знаёміла чытача-пачаткоўца з граматай. Стварылі такі падручнік манахі праваслаўнага віленскага Свята-Духава манастыра. Падзея незвычайнай значнасці, асабліва, калі ўлічыць, што сфарміраванай сістэмы адукацыі тады яшчэ не было.

— У канцы XVI стагоддзя праваслаўная царква знаходзілася ў крызісе. З аднаго боку — перад войскамі мусульман паў Канстанцінопаль, які да гэтага быў духоўным цэнтрам праваслаўя. З другога — пэўны ўплыў на розум вернікаў зрабіла Рэфармацыя. Вельмі шмат людзей, у тым ліку багатых і ўплывовых, перайшлі ў пратэстанцтва. Пётр Скарга і многія іншыя дзеячы сур'ёзна папракалі Царкву ў перажытках. Маўляў, і ў традыцыях яна закасцянела, і царкоўнаславянскай мовай, на якой вядуцца набажэнствы, простыя людзі даўно не карыстаюцца... Ды што там, нават школ пры праваслаўных храмах няма! — малюе вобраз тагачаснай эпохі Аляксандр Суша.

Зразумела, знайшліся людзі, што вырашылі даць годны адказ на папрокі. Пры праваслаўных храмах з'яўляліся царкоўныя брацтвы, а потым і школы, друкарні. Віленскі Стара-Духаў манастыр стаў асноўным «метадычным цэнтрам» у кіраванні адукацыяй. Пры ім узнікла манастырская школа, якая стала галоўным адукацыйным цэнтрам на тэрыторыі Вялікага Княства Літоўскага. Таму нічога дзіўнага, што праз нейкі час манахі падрыхтавалі і адпаведны падручнік для першапачатковага навучання. Ён быў напісаны на царкоўнаславянскай мове, але аўтары выпадкова ці наўмысна дадалі ў кнігу значную частку беларусізмаў, прычым у больш позніх выданнях сустракаюцца нават асобныя тэксты на тагачаснай беларускай мове.




**Найбольш верагодныя аўтары першага буквара Мялецій Смятрыцкі і Лявонцій Карповіч.**

## ДЛЯ РОЗУМУ І ДЛЯ ДУШЫ

Першая частка «Буквара» змяшчала ў сабе азбуку — царкоўнаславянскі алфавіт і склады, па якіх вучылі аб'ядноўваць літары. Затым пачыналіся тэксты для вывучэння. Замест мамы, якая мыла раму, дзеці пачатку XVII стагоддзя чыталі пералікі запаветаў, хрысціянскіх дабрадзействаў і цнотаў, а таксама грахоў, каб ведаць, як рабіць не трэба. Такім чынам, выданне адначасова выконвала не толькі адукацыйную, але і выхаваўчую ролю.

— Трэба разумець, што «Буквар» не быў наогул першай кнігай для пачатковага навучання. У Еўропе ўжо існавалі выданні падобнага кшталту, так званыя «абэцэдарыумы», «алфавіты», але «Буквар» стаў пачынальнікам прынцыпова новай і важнай для Усходняй Еўропы традыцыі выхавання, — тлумачыць Аляксандр Суша. — Яно грунтавалася на мясцовых асаблівасцях, захоўвала візантыйскую практыку ў малітвах, вызнанні веры, цнотах. Гэта значыць, захоўвала характэрныя для нашых зямель культурныя аспекты.

На першым буквары не пазначаны яго аўтары. Дакладна вядома толькі, што падрыхтаваны ён вандроўнымі манахамі віленскага манастыра. Адным з магчымых укладальнікаў даследчыкі лічаць Мялеція Сматрыцкага. Гэты культурны дзеяч ужо неаднойчы праяўляў сябе ў выдавецкай дзейнасці, напрыклад, выданне яго «Трэнаса», дзе змяшчаліся даволі жорсткія нападкі на каралеўскую ўладу і касцёл, фактычна, і зрабіла манахаў манастыра Свята-Духава вандроўнымі. Пасля выгнання з Вільні браты ў веры перанеслі друкарню ў мястэчка Еўе, што належала Багдану Агінскаму — аднаму з патронаў манастыра. Цікава, што Мялецій Смятрыцкі там жа выпусціць сваю «Граматыку» — лагічны працяг «Буквара».

Другім найбольш верагодным аўтарам можна лічыць Лявонція Карповіча — кіраўніка манастыра, а таксама друкарні і школы пры ім. Гэта быў актыўны асветнік і прапаведнік, добра абазнаны ў кніжнай і наогул выдавецкай справе.

Мялецій Смятрыцкі вучыўся ў заходніх універсітэтах, шмат вандраваў і чытаў на замежных мовах. Ён цудоўна ведаў еўрапейскую практыку асветы і, натуральна, яе выкарыстаў. Лявонцій Карповіч працаваў са Стэфанам і Лаўрэнціем Зізаніямі, шмат бачыў выданняў віленскіх і замежных. Абодва гэтыя асветнікі цудоўна ведалі грэчаскія, лацінскія і польскія традыцыі выдання кніг. Так што яны выкарысталі найлепшыя моманты еўрапейскай адукацыі, звязаўшы іх з мясцовымі рэаліямі, сваёй моваю і духоўна-выхаваўчай практыкай.

Аднак былі і яскравыя адрозненні ад лацінскіх «абацэдарыумаў». Напрыклад, вучням прапаноўвалі азнаёміцца з пералікам запаветаў, блажэнстваў, дабрадзействаў, «парад Гасподніх» і гэдак далей. Натуральна, усё гэта бралася з Бібліі, але пад пералікамі можна бачыць спасылкі на духоўных аўтарытэтаў візантыйскага хрысціянства.

## ПАДРУЧНІК ДЛЯ ІМПЕРАТАРА

Па якой жа кнізе вучыліся дзеці ў XVII стагоддзі? Гартаем разам з Алесем Сушай фотаздымкі друкаваных старонак, (на жаль, арыгінала ў Беларусі няма).

— Гадоў пятнаццаць назад я ўпершыню пачуў згадку, быццам бы недзе ў замежных бібліятэках захоўваецца самы стары буквар і нібыта выдадзены ён быў на тэрыторыі Беларусі, — дзяліцца суразмоўнік. Мяне падобныя звесткі зачапілі, таму, калі надарылася нагода з'ездзіць у Лондан па працоўным заданні, вырашыў паспрабаваць дабрацца да гэтай кнігі. У бібліятэцы Мідл Тэмпл я пераканаўся, што гэта кніга не памылка і не міф. У далейшым удалося адшукаць і папрацаваць з дацкім экзэмплярам, так што сёння даследчыкі могуць параўнаць два гэтыя асобнікі.

Арыгінал «Буквара» мае звычайную драўляную вокладку, якая раней была абцягнута скурай. На тытульным аркушы бачны герб Агінскіх — патронаў выдавецкай справы. Наступная старонка — малітва, без якой у тыя часы не пачыналася ніякая добрая справа.

Далей чытач знаёміцца з алфавітам. Для спецыялістаў ён добра зразумелы, а вось сучаснаму неабазнанаму чалавеку было б цяжкавата разабрацца з «фетамі» ды «іпсіланамі». Дарэчы, літары надрукаваны як у прамым, так і ў адваротным парадку. Цікавая асаблівасць звязана з літарай «г» — іх насамрэч дзве. Такім чынам вучань адразу раздзяляў «г» выбухное і «г» фрыкатыўнае, характэрнае для беларускай і ўкраінскай моў. Прычым у ранейшых выданнях падобнае адасабленне амаль не сустракаецца, а тут, у падручніку, пададзена як норма.

Што датычыцца візуальнай часткі, то нягледзячы на маленькі фармат, друкары стараліся зрабіць кнігу яшчэ і прыгожай. Яны выкарыстоўвалі шрыфты розных памераў, літы наборны арнамент, гравюры, буквіцы, канцоўкі і застаўкі. Дарэчы, некаторыя элементы выкананы ў стылістыцы, блізкай да афармлення кніг Францыска Скарыны.

— Адзін з парадоксаў «Буквара» — нягледзячы на шматтыражнасць і частыя перавыданні, да нашага часу захавалася літаральна пара асобнікаў. Не, кнігі не знішчалі, як можна было б падумаць. Проста чытачы так актыўна імі карысталіся, што літаральна зачытвалі да дзірак. Асобнік у Лондане захаваўся толькі таму, што быў набыты калекцыянерам і некалькі стагоддзяў праляжаў у архівах без ужытку, — расказвае Алесь Суша.

Традыцыя выдання адукацыйных кніг на Беларусі перарвалася з Першым падзелам Рэчы Паспалітай і аднавілася толькі ў пачатку XX стагоддзя. Аднак ініцыятыва, якая ўзнікла 400 гадоў таму, прыжылася на іншых землях і знайшла працяг. Слова «Буквар» увайшло ў дзясяткі моў: ад цыганскай, чарнагорскай і балгарскай да чукоцкай і якуцкай, не кажучы ўжо пра беларускую, рускую і ўкраінскую. Цікава, што асабліва многа сіл для распаўсюджвання «Буквара» прыклаў Сімяон Полацкі.

Як вядома, асветнік і педагог з Полацка быў выхавацелем дзяцей рускага цара. Пасля таго як выданне трапіла ў Расію, Сімяон Полацкі ў 1679 годзе выпусціў самы поўны і самы дакладны буквар на маскоўскіх землях і падараваў яго маленькаму царэвічу, што ў будучым увойдзе ў гісторыю як Пётр I. Так што, хто ведае, можа «заходніцкія ўплывы», якімі папракалі Сімяона Полацкага, падзейнічалі ў тым ліку і на светапогляд расійскага імператара?

Да канца жніўня супрацоўнікі Нацыянальнай бібліятэкі абяцаюць выдаць трохтомнае факсімільнае выданне першага ў свеце буквара. Плануецца, што адзін том будзе дакладна перадаваць змест старажытнай кнігі, у другім змесціцца яго пераклад на сучасную беларускую мову, а трэці стане зборам даследаванняў па гісторыка-культурных, педагагічных, лінгвістычных і іншых аспектах.

Акрамя таго, сёння ідзе падрыхтоўка мерапрыемстваў па ўшанаванні першага выдання ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі, у Вільні, на месцы, дзе буквар быў задуманы, і ў Лондане, дзе захаваўся адзіны поўны асобнік, і яшчэ шмат у якіх іншых гарадах: Маскве, Парыжы, на кватэры ААН у Швейцарыі...

Для замежнага даследчыка будзе цікава пагартаць першы ў свеце буквар з некалькіх прычын. Так, адны ўбачаць у ім важны крок у гісторыі адукацыі, другія змогуць адсачыць важны зрух у галіне развіцця царкоўнаславянскай мовы, трэція ацэняць важную з'яву кніжнай культуры, чацвёртыя зразумеюць яго як знамянальную падзею ў гісторыі рэлігіі і духоўнасці.

Што датычыцца Беларусі, то наша гісторыя асветы ўзбагацілася яшчэ адной значнай падзеяй.

**Рагнеда ЮРГЕЛЬ.**




■ Найноўшая гісторыя

# МЯЖА БЫЛА ПАД МІНСКАМ

**Невялікі мост на шляху да Купалаўскага мемарыяльнага запаведніка Вязынка стаў мінулай нядзеляй мостам у далёкія часы: на зялёных берагах з амаль стагадовай даўніны з'явіліся ўмацаванні з кулямётамі, праход прыпынілі тагачасныя памежнікі са зброяй. Каля радыёстанцыі завіхаўся сувязіст, а непадалёку са старога патэфона даносіліся даваенныя мелодыі...**

